Другое жыццё культурных каштоўнасцяў

СТАР. 2

Сабраць дзіця ў аздараўленчы лагер

СТАР. 6

Кузьма Чорны — беларускі Дастаеўскі

СТАР. 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. СЕРАДА № 107 (28217) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ПЫТАННЕ БЯСПЕКІ І АЎТАРЫТЭТУ

СНД павінна стаць палітычным і эканамічным цэнтрам сілы

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт на сустрэчы з кіраўнікамі дэлегацый, якія прымаюць удзел у XVI сесіі Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаў — удзельніц СНД.

Кіраўнік дзяржавы пераканаты, што неабходна больш поўна выкарыстоўваць магчымасці такога важнага інтэграцыйнага аб'яднання, як Садружнасць. Прэзідэнт звярнуў увагу на той факт, што апошнім часам адзначаюцца негатыўныя тэндэнцыі, разыходжанні паміж членамі СНД, жаданне некаторых з іх дыстанцыявацца ад якіх-небудзь абавязацельстваў і быць проста назіральнікамі, а то і зусім выйсці са складу арганізацыі. Нягледзячы на тое, што СНД у яе цяперашнім выглядзе і падвяргаецца крытыцы, беларускі бок лічыць, што патэнцыял супрацоўніцтва далёка не вычарпаны. На думку Аляксандра Лукашэнкі, неабходна надаць новы імпульс дзейнасці гэтай арганізацыі і ўзняць яе аўтарытэт на міжнароднай арэне.

Прэзідэнт пераканаты, што органы фінансавага кантролю могуць сыграць адну з вядучых роляў у працэсе далейшага станаўлення СНД. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што «ўпарадкаванне руху грошай і каштоўных папер, выкарыстанне іншых актываў на вялізнай частцы еўразійскага кантынента — гэта гарант стабільнасці і эканамічнай бяспекі нашых краін». На думку Аляксандра Лукашэнкі, толькі пры ўмове жорсткага дзяржаўнага кантролю за фінансавымі патокамі, строгага захавання законнасці ў гэтым сектары можна паспяхова развівацца. «Неабходна паставіць непераадольны заслон безгаспадарчасці, нямэтаваму выкарыстанню бюджэтных сродкаў, уцечцы капіталу за мяжу, незаконным валютным аперацыям, карупцыі і іншым негатыўным з'явам», — упэўнены Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы лічыць, што ў сучасных умовах найважнейшай задачай стратэгічнага значэння з'яўляецца ўзмоцненая каардынацыя дзеянняў кантрольных органаў краін СНД, а таксама выпрацоўка імі сумесных падыходаў да прадухілення фінансавых парушэнняў, абмен вопытам у засваенні новых метадаў работы. Гэта асабліва важна цяпер, калі свет адзін за адным скаланаюць крызісы, што самым неспрыяльным чынам адбіваецца на становішчы спраў у краінах Садружнасці. Гаворка ідзе пра бяспеку кожнай з дзяржаў Садружнасці паасобку і палітыка-эканамічнай моцы СНД у цэлым.

Удзельнікі сустрэчы пагадзіліся з важнасцю ролі эканамічнай бяспекі, якая ў сучасных умовах сапраўды набывае ўсё большае значэнне, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. Тэмы, якія абмяркоўваліся, тычыліся глабальных пытанняў развіцця СНД, выяўлення болевых кропак дзейнасці арганізацыі і выпрацоўкі стратэгіі сумесных дзеянняў, у тым ліку ў пытаннях фінансавага кантролю, на бліжэйшую перспектыву.

Кіраўнікі вышэйшых органаў фінансавага кантролю краін Садружнасці пазітыўна ацанілі поспехі Беларусі ў пытаннях дзяржаўнага кантролю, а таксама ў цэлым развіцця краіны.

БУДОЎЛЯ ВАМ ДА ТВАРУ!

Фота БЕЛТА.

У невялікім райцэнтры Лёзна, што на Віцебшчыне, на самай мяжы з Расіяй, актыўна, як і па ўсёй краіне, узводзяцца новыя сучасныя будынкі. Да гэтай адказнай справы далучаюцца лепшыя спецыялісты. Напрыклад, Настасся СОБАЛЕВА за кароткі час асвоіла прафесію інжынера-будаўніка, цяпер ёй давяраюць самыя адказныя ўчасткі ў рабоце. Малады спецыяліст паедзе на Усебеларускі народны сход прадстаўляць свой рэгіён. А пакуль яна з калегамі-мужчынамі Дзмітрыем ВАЙЦЯХОЎСКІМ, Аляксандрам ВІНАГРАДАВЫМ і Максімам ШАЛУХІНЫМ абмяркоўвае вытворчыя пытанні.

ЛІЧБА ДНЯ

$4 млрд 271,6 млн

у эквіваленце склалі золатавалютныя рэзервы Беларусі на 1 чэрвеня — за май яны павялічыліся на $43,1 млн. «Падтрыманню золатавалютных рэзерваў садзейнічалі паступленне сродкаў ад продажу Нацыянальным банкам і Міністэрствам фінансаў аблігацый, намініраваных у замежнай валюце, купля Нацбанкам замежнай валюты на таргах Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама паступленні ад спагнання экспартных пошлін на нафту і нафтапрадукты», — растлумачылі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка. Адмоўны ўплыў на аб'ём золатавалютных рэзерваў у асноўным аказала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 08.06.2016 г.

Долар ЗША	19850,00	▼
Еўра	22559,00	■
Рас. руб.	304,05	▲
Укр. грыўня	795,03	▼

■ Сябруем рэгіёнамі

КАНТРАКТАЎ — НЕ МЕНШ ЧЫМ НА $300 млн

У сталіцы пачаў работу трэці Форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Нягледзячы на тое, што пакуль гэта мерапрыемства не мае шматгадовай гісторыі, Форум ужо зараз прыцягвае ўвагу бізнесменаў і палітыкаў абедзвюх краін. Паўдзельнічаць у ім прыехалі прадстаўнікі каля 40 расійскіх рэгіёнаў.

УДЗЕЛЬНІКАЎ — УДВАЯ БОЛЬШ

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ падчас сустрэчы са сваёй калегай — **Валянцінай МАЦВІЕНКАЙ, спікерам Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі**, звярнуў увагу: на першы Форум рэгіёнаў, які таксама праходзіў у нашай краіне, прыехалі прадстаўнікі 19 расійскіх рэгіёнаў. Сёлета — удвая больш — прагрэс відавочны.

— Акрамя тых 39 пагадненняў, якія плануецца прыняць, вельмі вялікі камерцыйны складнік, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч. — Мы лічым, што экспартна-імпартных кантрактаў будзе падпісана не менш чым на $300 млн.

На яго думку, гэта сведчыць аб дастаткова высокім базісе ў гандлёва-эканамічнай сферы, а таксама аб тым, што рэзервы ёсць і іх можна нарошчваць. Спікер верхняй палаты запэўніў, што беларускім і расійскім бакамі будуць прыняты максімальныя намаганні для таго, каб апраўдаць чаканні ад Форуму.

— Для нас высокі гонар і адказнасць, што ўдзел у ім прымаюць прэзідэнты Беларусі і Расіі, — асобна заўважыў ён.

СТАР. 2

■ Здаёмся!

РЭПУТАЦЫЯ ЦТ ДАРАГОГА КАШТУЕ,

або Усё, што вы хацелі ведаць пра цэнтралізаванае тэсціраванне

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

У 2016 годзе, па прагнозах расійскіх экспертаў, выдаткі дзяржавы на правядзенне адзінага дзяржаўнага экзамену (АДЭ) складуць рэкордную суму — 2 млрд рублёў. Каб папярэдзіць магчымую ўцечку інфармацыі з экзаменацыйных аўдыторый, для апошніх набываюцца сістэмы відэаназірання (а па краіне задзейнічана 59 тысяч аўдыторый). На ўваходах у навучальныя ўстановы ўстанаўліваюцца металічныя рамкі. За парадкам на экзамене праз інтэрнэт сочаць анлайн-наглядальнікі.

Сачыненне замест АДЭ?

Ці не таму паведамленне пра тое, што ў Дзяржду му паступіў законапраект аб адмене адзінага дзяржаўнага экзамену, многія ўспрынялі з недаверам. Усё ж столькі грошай і працы ўкладзена ў агульную справу! Але пазней інфармацыя знайшла пацвярджэнне: як высветлілася, заканадаўчы сход Карэліі прапанаваў зрабіць АДЭ па рускай мове добраахвотным і адмяніць адзіны дзяржаўны экзамен па матэматыцы на базавым узроўні.

СТАР. 3

■ Ёсць пытанне!

ГРОШЫ КАПАЛІ З-ПАД КРАНА

Магілёўскі пенсіянер Васіль Лявоненка лічыць, што камунальнікі... перашкаджаюць яму эканоміць ваду

Васіль Паўлавіч спадзяецца, што пытанне вырашаць на дзяржаўным узроўні.

— Не буду плаціць за чыюсьці безгаспадарчасць, — заяўляе ён з парога і дэманструе цэлы стос афіцыйных папер. — Гэта ўсё адпіскі, а справай ніхто займацца не хоча.

Васіль Лявоненка жыве ў Магілёве ў доме па Пушкінскім праспекце на апошнім — 9-м паверсе. Праблема ў тым, што гарачая вада ў яго кран паступае не адразу — прыходзіцца спачатку некалькі літраў халоднай зліваць. Заяўнік сведчыць, што ўрэзка ў трубу, па якой ідзе гарачая вада, у яго санвузле знаходзіцца зверху, у той час як на астатніх паверхах — знізу. Там усё ў парадку: людзі ўключылі гарачую ваду — адразу карыстаюцца. А вось у Лявоненкі і тых, хто жыве на адной з ім пляцоўцы, праблема. Каб вада прагрэлася да сацыяльнага нарматыву — плюс 50 градусаў, трэба літраў 5-6 зліць.

— Так было з 1979 года, калі дом здалі, — сведчыць заяўнік. — Раней, калі вада лілася ракой, на гэтую акалічнасць увагі не звярталі. А цяпер прыборы лічаць кожны літр. Я плачу з разліку, што яна плюс 50 градусаў, а атрымліваю халодную, — абураецца ён.

СТАР. 3

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

На вучэннях НАТА адпрацоўваюць абарону ад нападу на краіны Балтыі і Польшчу

У Польшчы 7 чэрвеня пачалася практычная фаза вучэнняў НАТА пад кодавай назвай «Анаконда-2016». Яны працягнуцца да 17 чэрвеня. Адной з першых аперацый стане высадка на палігон паблізу горада Торунь каля дзвюх тысяч польскіх, амерыканскіх і брытанскіх дэсантнікаў разам з гаўбіцамі, транспартнымі сродкамі і абсталяваннем. Сцэнарый вучэнняў уяўляе з сябе патэнцыйны канфлікт паміж двума ўмоўнымі альянсамі. У адзін з іх уваходзіць сама Польшча, краіны Балтыі і некалькі іншых рэальных дзяржаў, а ў другі — выдуманыя краіны Ботнія, Тарыке і Ліндсі. Паводле сцэнарыя падчас канфлікту адбываецца дэстабілізацыя сітуацыі ў Балтыйскім рэгіёне, уварванне сіл саперніка ў краіны Балтыі і Польшчу і анексія тэрыторыі.

Ахвярамі тэракта ў Стамбуле сталі 11 чалавек

У Стамбуле прагрымеў выбух побач з аўтобусным прыпынкам, паведамляе CNN Turk. У выніку тэракта загінулі 11 чалавек, каля 36 атрымалі раненні. Паводле слоў губернатара рэгіёна Васіпа Шахіна, сямёра загінулых былі паліцэйскімі. Інцыдэнт адбыўся ў час пік у квартале Везнеджылер недалёка ад адной са стамбульскіх ВНУ. Мяркуецца, што была падарваная бомба з дыстанцыйным кіраваннем, мішэнню тэракта быў паліцэйскі аўтобус. Адказнасць за тое, што адбылося, на сябе пакуль ніхто не ўзяў.

Аўстралія прыдумала, як пазбегнуць з'яўлення новых курцоў

Гэта першая краіна, дзе ўступіў у сілу закон аб забароне брэндавых пачкаў цыгарэт. З 1 снежня 2012 года ўсіх вытворцаў тытуню ў Аўстраліі абавязалі прадаваць сваю прадукцыю ў аднолькавай упакоўцы, 75% якой займаюць карцінкі з папярэджаннямі пра шкоду курэння. Марку цыгарэт паказваюць унізе пачка дробным шрыфтам. А нядаўна міністр аховы здароўя аўстралійскага штата Квінсленд Кэмеран Дзік падтрымаў ідэю Савета па раку аб увядзенні пажыццёвай забароны на курэнне для людзей, народжаных пасля 2001года, паведамляе «Vademecum».

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

Адным з варыянтаў вырашэння сітуацыі з бежанцамі можа стаць план Еўракамісіі заключыць партнёрскія пагадненні з дзевяццю краінамі Афрыкі і Блізкага Усходу. На фінансаванне такой ініцыятывы могуць быць выдзелены дзясяткі мільярдаў еўра.

У Беларусі ў студзені—маі гэтага года адкрыты 7 744 дэпазітныя рахункі на сямейны капітал у «ААБ Беларусбанк» на суму $77,44 млн. Усяго на 1 чэрвеня 2016 года адкрыта 19 326 рахункаў на суму $193,26 млн.

У Беларусі на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне насельніцтва, якое пацярпела ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС, у гэтым годзе накіроўваецца Br720,4 млрд.

Фінал нацыянальнага конкурсу прыгажосці «Міс Беларусь-2016» адбудзецца 19 чэрвеня ў Палацы спорту. За галоўны тытул пазмагаюцца 26 прыгажунь.

■ Я зноў выбіраю «Звязду»

ПРА ШТО ПЫТАЦЦА Ў ДЗІЦЯЦІ, ЧЫТАЙЦЕ Ў ГАЗЕЦЕ...

Прафесар кафедры педагогікі і менеджменту адукацыі Акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат педагагічных навук, дацэнт Мікалай ЗАПРУДСКІ:

— Да «Звязды» я прыйшоў праз адукацыйныя артыкулы. Прыемна, што калектыў рэдакцыі разумее, што будучыня краіны ў многім залежыць ад школы, ад таго, чаму і як вучаць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі. Таму чытачы маюць магчымасць далучыцца да праблем сучаснай школы, пачытаць думкі, якія выказваюць прафесіяналы, паглядзець, у якіх кірунках развіваецца перадавая практыка, убачыць, што ёсць педагогі, якія працуюць і развіваюцца адпаведна сусветным адукацыйным тэндэнцыям. Нам не патрэбна самаізаляцыя, настальгія па-мінулым, якое не вернеш...

Менавіта наша «Звязда» адной з першых «адкрыла» вельмі актуальную тэму медыяадукацыі. Не толькі педагогі, але і людзі іншых прафесій, пенсіянеры даведаліся пра неабходнасць выпрацоўкі ў сябе і ў падрастаючага пакалення крытычнага мыслення, якое з'яўляецца фільтрам у інфармацыйных патоках і дазваляе чалавеку разбірацца, дзе праўда, а дзе маніпуляцыя свядомасцю, і на гэтай аснове будаваць свае стратэгіі паводзін.

Газета не аднойчы знаёміла чытачоў праз артыкулы, рэпартажы з «круглых сталоў» з актыўнай ацэнкай — новай для нашай краіны тэхналогіяй навучання. Тэхналогіяй, якая ўключае дзяцей у актыўную дзейнасць, робіць іх адказнымі, матываванымі, дапамагае ім вучыцца, далучае бацькоў да адукацыйнага працэсу. Менавіта з газеты многія з іх даведаліся, што шкодна пытацца ў сына ці дачкі, якія прыйшлі са школы, што ты сёння атрымаў? Трэба пытацца, чаму ты навучыўся, што было цікавага, у чым сабой задаволены і чаму? Ці было табе сёння соромна, што цябе здзівіла і г.д.

Ужо гэтыя прыклады сведчаць, што «Звязда» асвятляе вельмі актуальную адукацыйную тэматыку. І, канешне, я не магу не падтрымаць адданасць журналістаў «Звязды» роднай мове. Для мяне мова — неад'емная частка майго жыцця. Таму хацелася б, каб кола прыхільнікаў і беларускай мовы, і беларускамоўнай газеты пашыралася...

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

5 разоў на тыдзень!

Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

Падпісацца на газету можна самымі рознымі спосабамі (нават не выходзячы з дома). Падрабязней пра гэта, а таксама кошт, падпісныя індэксы — на нашым партале zviazda.by.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

КАНТРАКТАЎ — НЕ МЕНШ ЧЫМ НА $300 млн

Фота БЕЛТА.

Адначасова з Форумам рэгіёнаў адкрыўся Беларускі аграпрамысловы тыдзень. Удзельнікі форуму наведалі выставу «Белагра-2016».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Валянціна Мацвіенка падзякавала беларускім калегам за арганізацыю Форуму і за тое, што на ім створаны добрыя ўмовы для працы.

— Кантакты па парламенцкай лініі арганічна дапаўняюць дыялогі на высокім, найвышэйшым узроўнях, — паведаміла яна. — Расійскі бок задаволены тэмпамі развіцця двухбаковага стратэгічнага партнёрства, фарміравання Саюзнай дзяржавы.

Старшыня Савета Федэрацыі падкрэсліла, што лідары дзвюх краін рэгулярна сустракаюцца асабіста, праводзяць тэлефонныя нарады. Актыўна ўзаемадзейнічаюць урады і прэм'ер-міністры, супрацоўнічаюць знешнепалітычныя ведамствы.

Што тычыцца парламенцкіх структур, то яны, па словах спікера верхняй палаты расійскага парламента, сумесна працуюць «як на двухбаковым узроўні, так і ў рамках Саюзнай дзяржавы, дзе ёсць магчымасць абмеркавацца вопытам заканатворчай работы, весці работу па далейшай гарманізацыі заканадаўстваў і стварацъ заканадаўча-прававыя ўмовы для рэалізацыі дамоўленасцяў, якія дасягаюцца на найвышэйшым і высокім узроўнях».

— Міжрэгіянальныя сувязі сталі канстантай двухбаковых сувязяў, — падкрэсліла Валянціна Мацвіенка. — Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва дае рэальныя вынікі ў розных сферах, значыць, гэты фармат вельмі запатрабаваны.

МЫ ЗА ШМАТБАКОВАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

Міхаіл Мясніковіч, адказваючы на пытанне прадстаўніка аднаго з расійскіх СМІ пра тое, ці не пашкодзяць беларуска-расійскаму стратэгічнаму супрацоўніцтву актыўныя кантакты нашай краіны з Еўрасаюзам, падкрэсліў, што неабходна атрымліваць выгаду са шматбаковага супрацоўніцтва.

— Мы выбудоўваем нармальныя паважлівыя адносіны і з іншымі краінамі, і гэта зусім не азначае, што яны павінны быць на шкоду Расіі, — заявіў старшыня Савета Рэспублікі. — Мы таксама з павагай ставімся да рашэнняў, якія прымаюцца Расіяй па супрацоўніцтве з трэцімі краінамі.

У сваю чаргу Валянціна Мацвіенка адзначыла, што ні Расія, ні Беларусь не імкнуцца да самаізаляцыі і гатовыя да ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва з іншымі інтэграцыйнымі аб'яднаннямі і дзяржавамі на раўнапраўных умовах, з улікам інтарэсаў адзін аднаго.

Падчас размовы з журналістамі Валянціна Мацвіенка, адказваючы на пытанне пра прыярытэты супрацоўніцтва Беларусі і Расіі ў няпросты ў эканамічным плане час, зрабіла акцэнт на тым, што скаардынаваныя дзеянні нашых краін па развіцці эканомікі, прамысловасці, сельскай гаспадаркі змякчылі наступствы негатыўных сусветных эканамічных тэндэнцый.

— Нягледзячы на існуючыя цяжкасці, аб'ёмы ўзаемнага гандлю паміж нашымі краінамі не знізіліся, а па шэрагу паказчыкаў нават выраслі, — прывяла прыклад яна. — Мы не кажам пра цэнавыя паказчыкі. Важна, што фактычныя аб'ёмы ўзаемнага тавараабароту захаваліся.

Што да саміх прыярытэтаў, то, па словах Валянціны Мацвіенкі, іх цэлы шэраг, які вызначаны лідарамі абедзвюх краін.

— Натуральна, гэта далейшае развіццё эканамічнага, інвестыцыйнага супрацоўніцтва. На сёння ў Беларусі працуе амаль дзве з паловай тысячы прадпрыемстваў з удзелам расійскага капіталу, з іх 1,5 тысячы — гэта сумесныя прадпрыемствы, каля тысячы — прадпрыемствы са 100%-ным расійскім капіталам. Але поле магчымасцяў тут далёка не вычарпана.

НА ШЛЯХУ ДА БЕЗБАР'ЕРНАГА РЫНКУ

Анатоль РУСЕЦКІ, намеснік старшыні верхняй палаты беларускага парламента, падчас трэцяга пасяджэння міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу па міжрэгіянальным супрацоўніцтве заявіў, што форум ужо даказаў сваю жыццяздольнасць.

— Супрацоўніцтва паміж нашымі рэгіёнамі стала напаўняць канкрэтным зместам увесь працэс развіцця Саюзнай дзяржавы, — адзначыў ён. — Разгляд практычных пытанняў супрацоўніцтва з прыцягненнем рэгіёнаў, суб'ектаў гаспадарання дазваляе здзяйсняць свайго роду маніторынг і выяўляць праблемы, што ўзнікаюць падчас рэалізацыі рашэнняў, якія прымаюцца ў інтэграцыйных аб'яднаннях.

У той жа час віцэ-спікер Савета Рэспублікі прызнаў, што ёсць у рамках беларуска-расійскага супрацоўніцтва і праблемныя пытанні.

— На жаль, мы пакуль не можам быць цалкам задаволеныя вынікамі нашай дзейнасці. Безумоўна, сур'ёзны ўплыў на гэта аказваюць і знешнія фактары, але і нам, відаць, неабходна больш выразна і канкрэтна вырашаць узнікаючыя праблемы. Дагэтуль захоўваюцца і бар'еры, і перашкоды ва ўзаемным гандлі. Спадзяюся, што мы сумеснымі намаганнямі створым агульны рынак без выняткаў і абмежаванняў. Галоўнае, што дынаміка станоўчая з абодвух бакоў нашай «двойкі».

Анатоль Русецкі звярнуў асобную ўвагу на неабходнасць інфармацыйнай падтрымкі тых інтэграцыйных працэсаў, што адбываюцца ў рамках Саюзнай дзяржавы. Па яго словах, яна павінна здзяйсняцца не толькі саюзнымі сродкамі масавай інфармацыі, але і іншымі.

Юрый ВАРАБ'ЁЎ, намеснік старшыні Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі, адзначыў, што ўжо час разгледзець прапановы, звязаныя з парадкам дня наступнага Форуму рэгіёнаў і парадкам дня чацвёртага пасяджэння міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі і Савета Федэрацыі.

— Дзейнасць нашай міжпарламенцкай камісіі ў рамках Форуму надае яму больш канкрэтыкі, — лічыць ён. — Для нас вельмі важна, каб рэгіянальнае супрацоўніцтва нашых дзяржаў складвалася ў практычнай сферы, каб мы атрымлівалі вынікі ад гэтага супрацоўніцтва.

* * *

Першы дзень Форуму быў насычаны самымі рознымі мерапрыемствамі. Гэта і пасяджэнні секцый па самых розных пытаннях — пачынаючы ад беларуска-расійскага супрацоўніцтва ў сферы працоўных адносін і сацыяльнай абароны і заканчваючы ўзаемадзеяннем у турыстычнай сферы. Падчас Форуму праходзяць і спецыялізаваныя мерапрыемствы, у тым ліку 26-я спецыялізаваная выстава «БЕЛАГРА-2016», Фестываль рэгіянальных тэлеканалаў Беларусі і Расіі «Вобраз часу», другі этап Спартакіяды Саюзнай дзяржавы для дзяцей і юнацтва, марафон дзіцячай творчасці «Дзве краіны — адзін лёс», маладзёжны форум IT-youth, шэраг міжнародных канферэнцый, семінараў, круглых сталоў. Дэлегаты Форуму прымаюць удзел і ў мерапрыемствах Дзён Масквы ў Мінску, што праходзяць зараз у нашай сталіцы.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ІНТЭГРАЦЫЙНЫЯ СУВЯЗІ

Сёння ў іх стварэнні значную ролю адыгрываюць СМІ

У межах трэцяга Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі ў Інстытуце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта працавала секцыя «СМІ як значны фактар міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння, фарміравання агульнай прасторы гуманітарных каштоўнасцяў».

— Галоўная задача Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі, якая была сфармулявана ў гэтым годзе, — сацыяльная праблематыка, — гаворыць **міністр інфармацыі Беларусі Лілія АНАНІЧ**. — Гэта тое, што выходзіць на канкрэтнага чалавека: роўныя правы грамадзян на працу, адукацыю, ахову здароўя. І ўсё гэта ў Саюзнай дзяржаве дынамічна развіваецца.

На думку міністра, сёння менавіта рэгіянальныя СМІ могуць найбольш удала адыграць ролю правадніка інтэграцыйных працэсаў Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. «Яны бліжэй да людзей, да той праблематыкі, якая тычыцца кожнага канкрэтнага чалавека. А аб'яднаўшы намаганні ўсёй інфармацыйнай прасторы Беларусі і Расіі, мы зможам магутна трансліраваць ідэі Саюзнай дзяржавы на сусветным інфармацыйным полі», — лічыць Лілія Ананіч.

Людміла БОКАВА, намеснік старшыні камітэта Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расійскай Федэрацыі па канстытуцыйным заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, упэўнена, што форум — найбольш удалы фармат для абмеркавання інтэграцыйных працэсаў. «Больш чым 30 інфармацыйных праектаў цяпер рэалізуецца паміж Рэспублікай Беларусь і суб'ектамі Расійскай Федэрацыі. Гэта добры паказчык і ў той жа час наша агульнае дасягненне. Асноўны лейтматыў сённяшняй сустрэчы — гэта стварэнне адзінай інфармацыйнай прасторы. Тым больш, зараз у нас ёсць цікавае судакрананне: у Расіі гэты год аб'яўлены годам кіно, у Беларусі — культуры», — паведаміла Людміла Бокава.

Аляксандр ВАРФАЛАМЕЕЎ, член Савета Федэрацыі ад заканадаўчага (прадстаўнічага) органа дзяржаўнай улады Рэспублікі Бурацыя, лічыць, што цікавасць да секцыі нездарма праявіла вялікая колькасць расійскіх рэгіянальных тэлерадыёкампаній з Расійскай Федэрацыі нездарма. «Гэта пацвярджае, што правядзенне Форуму — справа значная і актуальная. Сёння СМІ — галоўныя сувязныя ўжо не ніці, а надзейныя ланцужкі на высокім дзяржаўным узроўні», — мяркуе Аляксандр Варфаламееў.

Дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь КАРЛЮКЕВІЧ прысвяціў сваё выступленне саюзнаму супрацоўніцтву ў сферы літаратуры. «Значную ролю ў выкладанні інфармацыі аб падзеях, якія тычацца грамадскай, сацыяльнай, палітычнай сфер нашага жыцця, адыгрывае мастацкая літаратура. Мы — невялікая краіна. Але тая мастацкая прастора, тыя культурныя парадыгмы, якія генерыруюць мастакі слова Беларусі, стваралiся на працягу не аднаго дзесяцігоддзя і маюць адметнасць і каштоўнасць», — лічыць Алесь Карлюкевіч. Па яго словах, сёння паміж Беларуссю і Расіяй існуе шмат сумесных літаратурных праектаў, выдаюцца кнігі расійскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову. І праектаў з кожным годам становіцца больш.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ЯКІ ЁН, ВОБРАЗ ЧАСУ?

Фестываль рэгіянальных тэлекампаній Беларусі і Расіі працуе ў Мінску

Расійскія тэлеканалы стала «прапісаліся» ў эфірнай прасторы Беларусі. Вяшчае па спадарожніку і тэлеканал «Беларусь-24». Але так атрымалася, што з-за аб'ёмнага асвятлення жыцця палітычных і эканамічных цэнтраў абедзвюх краін паказ рэгіёнаў Беларусі ў расійскім эфіры і наадварот адышоў на другі план. Тыя, хто жыве ў памежных раёнах, яшчэ могуць глядзець рэгіянальныя тэлеканалы суседняй краіны. А як быць тым, хто знаходзіцца далёка ад рэтранслятараў, якія даюць гэтую магчымасць?

Менавіта тэме супрацоўніцтва рэгіянальных тэлеканалаў абедзвюх краін у творчым, культурным і асветніцкім складніках і прысвечаны Першы фестываль рэгіянальных тэлекампаній Беларусі і Расіі «Вобраз часу». А кампаніі, дзе выйшлі найлепшыя сюжэты, атрымалі дыпломы.

— Першы фестываль рэгіянальных тэлекампаній Расіі і Беларусі «Вобраз часу», ініцыяваны Міністэрствам інфармацыі, знайшоў жывы водгук у абедзвюх краінах, — сказала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ**. — Ён падтрыманы Саветам Рэспублікі Нацыянальнага сходу, Міністэрствам замежных спраў, Пастаянным камітэтам Саюзнай Дзяржавы. Для нас самае галоўнае, каб маштабнае супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі знаходзіла сваё адлюстраванне ў эфіры рэгіянальных тэлеканалаў. Мы разлічваем, што гэты праект не застанецца пілотным і будзем штогод прырастаць якасным кантэнтам. Можна сказаць, што ў нас з'яўляецца яшчэ адна прафесійная творчая пляцоўка, дзе супрацоўнікі тэлеканалаў Расіі і Беларусі будуць спаборнічаць у лепшых праектах.

Удзельнікамі мерапрыемстваў фестывалю сталі прадстаўнікі 27 тэлекампаній з рэгіёнаў Беларусі і Расіі: Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Калінінградскай, Кастрамской, Ленінградскай, Бранскай, Уладзімірскай і Іркуцкай абласцей, горада Сочы і Санкт-Пецярбурга, а таксама Чачэнскай Рэспублікі і Ямала-Ненецкай аўтаномнай акругі. Усяго ж тэлекампаніі прадставілі на суд журы каля 50 праектаў. Дыпломы 1 ступені на дзвюх фестывалі заваявалі дзве арганізацыі. Гэта абласная тэлерадыёкампанія «Русь» з Кастрамской вобласці Расіі і Лідскае тэлерадыёаб'яднанне з Гродзенскай вобласці Беларусі.

— Нашы супрацоўнікі ездзілі ў Крымск — горад у Краснадарскім краі Расіі, — гаворыць **галоўны рэдактар Лідскага тэлерадыёаб'яднання Ніна ПАЗНЯК**. — Матэрыял-прызёр прысвечаны дапамозе беларусаў у ліквідацыі наступстваў разбуральнай паводкі ў Крымску ў 2012 годзе.

Як адзначыў на цырымоніі ўзнагароджання старшыня Тэлерадыёвяшчальнай арганізацыі Саюзнай дзяржавы Ігар Угольнікаў, рэгіянальнаму вяшчанню дадзены старт:

— На нашым тэлеканале прайшоў дзень Уфы, пасля яго зменяць Астрахань і Магілёў. Дзень 22 чэрвеня будзе прысвечаны Брэсту. Пакажам сюжэты і з Грознага, са Смаленска... Для таго і працуе Саюзнае тэлебачанне, каб паказваць шырокаму гледачу жыццё рэгіёнаў Расіі і Беларусі.

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Рыгор РАПОТА ў сваю чаргу падзяліўся развагамі наконт важнасці такога супрацоўніцтва:

— Часта сцвярджаюць, што трэба адраджаць патрыятызм. Але ён праяўляецца ў любові да таго месца, дзе ты жывеш, да сям'і, да бацькоў, прыроды, гісторыі. І ўсё гэта ёсць і ў беларусаў, і ў расіян. Мабыць, гэта якраз і ёсць вышэйшая місія журналістыкі — абудзіць цікавасць да сваёй жа краіны.

Праграмай фестывалю прадугледжаны ўдзел журналістаў абедзвюх краін у III Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі, правядзенне творчых тэлемайстэрняў, стварэнне рэпартажаў з месца падзей. Напярэдадні госці наведалі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама Белтэлерадыёкампанію. Ва ўнікальнай на прасторах СНД студыі «600 метраў» яны пазнаёміліся з дзейнасцю медыяхолдынга.

— Нашы расійскія калегі цікавіліся рэкламай на тэлебачанні, папулярнымі праграмамі, культурным складнікам, — паведаміў карэспандэнту «Звязды» **генеральны прадзюсар Белтэлерадыёкампаніі Кірыл КАЗАКОЎ**. — Абласным тэлерадыёкампаніям паступілі прапановы аб супрацоўніцтве. Канешне, тут трэба ўлічваць, якія менавіта перадачы аб жыцці, напрыклад, Магілёўшчыны, будуць цікавыя гледачам, скажам, Курскай вобласці. Разам з тым выбраны ўжо пэўны кантэнт для відэатэк.

Валяр'ян ШКЛЕННІК. *schklennik@zviazda.by*

АСАБЛІВАЯ МІСІЯ

Удзельнікі XVI сесіі Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаў — удзельніц СНД прытрымліваюцца таго пункту гледжання, што сёння асаблівая місія ў пытаннях забеспячэння эканамічнай бяспекі адводзіцца вышэйшым органам фінансавага кантролю. Дэталёвы аўдыт і кантроль, якія імі праводзяцца, накіраваны не толькі на выяўленне «болевых» кропак у эканоміцы і сацыяльнай сферы, але і на выпрацоўку прапаноў па выпраўленні сітуацыі, у тым ліку на заканадаўчым узроўні.

— За 16 гадоў свайго існавання Савет зарэкамендаваў сябе са станоўчага боку, — адзначыў **Леанід АНФІМАЎ, старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю нашай краіны**. — Ні ў каго з кіраўнікоў дзяржаў СНД не ўзнікла сумненняў наконт неабходнасці гэтага органа. Фактычна, ён ствараўся жыццём, быў запатрабаваны аб'ектыўнымі ўмовамі і прадпасылкамі, якія складаліся ў нацыянальных эканоміках нашых краін.

Па словах Леаніда Анфімава, Савет аказвае падтрымку кіраўнікам краін — удзельніц СНД у тым, што тычыцца паглыблення інтэграцыйных працэсаў, якія адбываюцца на постсавецкай прасторы.

Акрамя таго, яшчэ адна не менш важная мэта Савета, па словах старшыні КДК, — наладзіць цеснае ўзаемадзеянне па лініі органаў фінансавага кантролю ў адпаведнасці са спецыфічнасцю выконваемых імі прафесійных задач на тэрыторыях дзяржаў Садружнасці.

— Трэба, каб праз супрацоўніцтва паміж нашымі органамі мы змаглі наладзіць цеснае ўзаемадзеянне на шляху вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у нацыянальных эканоміках, — заявіў Леанід Анфімаў.

Сесія завяршылася падпісаннем выніковых дакументаў.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ПАДЗЕІ ФАКТЫ НАВІНЫ

ЗАЯВЫ НА ПРЫВАТЫЗАЦЫЮ ПРЫМАЮЦЦА ДА 1 ЛІПЕНЯ

Менавіта да гэтага дня, у адпаведнасці з Указам кіраўніка дзяржавы ад 16 снежня 2013 года № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін», грамадзяне маюць права звярнуцца з заявай аб прыватызацыі займаемага імі жылля.

Улічваючы, што да названай даты застаецца менш за месяц, Дзяржкаммаёмасць з мэтай папярэджання ўзнікнення пытанняў пры рэалізацыі грамадзянамі сваіх правоў на прыватызацыю жылых памяшканняў дадаткова звяртае ўвагу на агульныя падыходы да вызначэння кошту жылых памяшканняў дзяржаўнага жыллёвага фонду для мэт іх прыватызацыі ў нашай краіне.

Для дадатковага інфармавання насельніцтва Дзяржаўны камітэт па маёмасці 11, 18 і 25 чэрвеня арганізуе спецыяльныя «прамыя тэлефонныя лініі» па пытаннях вызначэння кошту жылых памяшканняў для прыватызацыі. Паводле інфармацыі прэс-службы камітэта 11 і 18 чэрвеня з 9.00 да 12.00 гадзін на пытанні грамадзян адкажа **начальнік упраўлення ацэнкі Дзяржкаммаёмасці Дзіна Міхайлаўна САКАЛОЎСКАЯ**, кантактны тэлефон: (017) 288-12-26. А 25 чэрвеня з 9.00 да 12.00 гадзін на пытанні грамадзян адкажа **намеснік начальніка ўпраўлення ацэнкі Дзяржкаммаёмасці Вячаслаў Валер'евіч БЕЛАВУСАЎ**, кантактны тэлефон: (017) 233-96-74.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

КАВЯРНІ НЕ ПАВІННЫ ДЫКТАВАЦЬ УМОВЫ

Міністэрства гандлю правяло маніторынг парадку прыёму (афармлення) папярэдніх заказаў на абслугоўванне ў аб'ектах грамадскага харчавання.

Падчас яго выяўлена, што некаторымі такімі суб'ектамі ўстанаўліваецца мінімальная сума перадаплаты пры заказе, а таксама мінімальная сума заказу на аднаго чалавека як пры правядзенні вяселляў, юбілеяў, так і пры арганізацыі мерапрыемстваў для выпускнікоў. У міністэрстве нагадалі суб'ектам грамадскага харчавання аб недапушчальнасці такога кроку: незахаванне патрабаванняў пастановы Мінгандлю ад 29 лютага 2008 года №7 «Аб парадку афармлення папярэдніх заказаў на абслугоўванне, аказанне паслугі ў аб'ектах грамадскага харчавання» можа пацягнуць для фізічнай ці юрыдычнай асобы адміністрацыйную адказнасць.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

ГЕРОІ «ЧЫРВОНКІ» — НАЙЛЕПШЫЯ Ў СВЕЦЕ

Фота Надзеі БУЖАН.

Маладая беларуская артыстка перамагла на конкурсе цыркавога мастацтва ў Кіеве.

20-гадовая студэнтка хімічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта Алена Клімовіч, пра якую зусім нядаўна пісала «Чырвонка. Чырвоная змена», днямі заваявала залаты медаль на I Міжнародным дзіцячым і маладзёжным фестывалі цыркавога мастацтва ў сталіцы Украіны. Нумар беларускай цыркачкі пад назвай «Антыпод «Іншая» назвалі найлепшым у катэгорыі ад 18 да 25 гадоў. Сапернікамі дзяўчыны былі больш як паўсотні талентаў з розных краін.

Усяго ў фестывалі ўзялі ўдзел каля 200 маладых артыстаў з Украіны, Беларусі, Ізраіля, Егіпта, Латвіі. Для пераможніц гімнасткі, якая паспявае вучыцца і працаваць у Белдзяржцырку, гэта ўжо трэцяя буйная ўзнагарода за апошні час. Днямі Алена Клімовіч стала яшчэ і стыпендыяткай Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі.

Убачыць пераможны нумар у выкананні артыстки на свае вочы можна ўжо цяпер — ён уключаны ў праграму «Я працую чараўніком», якая будзе дэманстравацца ў Белдзяржцырку да 24 ліпеня.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

«БМВ» УДАРЫЎСЯ Ў ДРЭВА

Міліцыя высвятляе месцазнаходжанне вадзіцеля аўтамабіля «БМВ», які ўрэзаўся ў дрэва, пасля чаго пакінуў месца дарожна-транспартнага здарэння.

Гэты выпадак адбыўся ў сталіцы на скрыжаванні вуліц Бельскага і Адоеўскага. Згодна з папярэдняй інфармацыяй, легкавы аўтамабіль ўрэзаўся ў дрэва на вялікай хуткасці. Пасля таго кіроўца і пасажыр пакінулі месца аварыі. Асоба першага ўжо ўстаноўлена, супрацоўнікі міліцыі высвятляюць яго месцазнаходжанне і абставіны здарэння.

У гэты ж дзень у Мінску адбылося яшчэ адно ДТЗ, у якім легкавік «Міцубісі» сутыкнуўся з нерухомым прадметам. На развязцы праспектаў Жукава і Дзяржынскага яго кіроўца выехаў за межы праезнай часткі і ўдарыўся ў бетонную асвятляльную мачту. Па інфармацыі УДАІ УУС Мінгарвыканкама, кіроўцу раптоўна стала дрэнна за рулём.

ШТО ВЫПІЛІ, УСТАНОВІЦЬ ЭКСПЕРТЫЗА

Тры чалавекі памерлі ў Карэліцкім раёне пасля ўжывання невядомай спіртавой вадкасці.

Па інфармацыі прэс-службы УУС Гродзенскага аблвыканкама, траіх жыхароў вёскі Некрашэвічы знайшлі ўжо мёртвымі. Высветлена, што напярэдадні ў госці да двух аднавяскоўцаў прыйшла жанчына, якая прынесла з сабой паўтаралітровую пластыкавую ёмістасць з вадкасцю, якая змяшчала спірт. Кампанія распіла яе, і праз некалькі гадзін пасля гэтага ўсе трое сканалі. Паходжанне вадкасці пакуль невядомае, прызначана судова-хімічная экспертыза. Па факце прычынення смерці па неасцярожнасці дзвюм і больш асобам заведзена крымінальная справа.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

«Менавіта адноўленыя помнікі запатрабаваныя беларусамі»

За апошнія пяць гадоў другое жыццё атрымалі многія аб'екты духоўна-культурнай спадчыны

Нягледзячы на не самы просты час, у нашай краіне вядуцца аднаўленчыя работы на аб'ектах гісторыка-культурнай спадчыны, якія вымагаюць, натуральна, досыць значнага фінансавання. За апошнія пяць гадоў адноўлены многія знакавыя помнікі — напрыклад, сядзіба ў Лошыцкім парку ў Мінску, палац Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне і многае іншае. Адрэстаўраваныя каштоўнасці цяпер можна ўбачыць разам у адным месцы — іх фотаздымкі прадстаўлены ў адмысловым праекце, размешчаным на агароджы сталічнага парку Чалюскінцаў. Выставу «Спадчына Беларусі. Адноўленыя архітэктурныя каштоўнасці» прадставілі фотамастакі Алег Лукашэвіч і Аляксандр Аляксееў сумесна з арт-цэнтрам Вольгі і Андрэя Смалякоў.

Галоўны спецыяліст Галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага гарвыканкама Марыя ЯСЮК, якая прысутнічала на адкрыцці выставы, заўважыла:

— Сёлетні праект, што размяшчаецца на гістарычнай агароджы парку Чалюскінцаў, — ужо пяты па ліку. Тры з іх называліся «Спадчына Беларусі». У 2014 годзе мінчукі і госці сталіцы змаглі пазнаёміцца з замкамі, цэрквамі, сабораміі, якія захавала шматпакутная Беларусь. У 2015 годзе аўтары праекта дапамаглі пазнаёміцца з чатырма аб'ектамі, што былі ўнесены ў спіс гістарычнай спадчыны ЮНЕСКА. А сёлета мы бачым адноўленыя каштоўнасці Беларусі. Гэта не проста адукацыйны праект, які ўпрыгожвае сталіцу. Ён адлюстроўвае нашу духоўнасць, сувязь пакаленняў. А таксама гэта яскравы прыклад дзяржаўна-прыватнага партнёрства.

З 2004 па 2016 год выдадзена і рэалізавана 44 500 экзэмпляраў альбома «Спадчына Беларусі». З 2003 па 2015 год аўтарамі праведзена больш за 20 рэспубліканскіх і міжнародных выстаў, мэтай якіх было прадстаўленне гісторыка-культурнага багацця нашай краіны.

Пятнаццаць гадоў таму не было ні ратушы ў Магілёве, ні ратушы ў Мінску, ні многіх іншых аб'ектаў.

Старшыня Саюза мастакоў Беларусі Рыгор СІТНІЦА, ацэньваючы багатую архітэктурную спадчыну, якую мы маем, вырашыў звярнуцца да слоў класіка:

— Хачу працытаваць верш Янкі Купалы: «І ў белы дзень, і ў чорну ноч, я ўсцяж раблю агледзіны. Ці гэты скарб не збрыў дзе проч? Ці трутнем ён не з'едзены?..»

Выстава «Спадчына Беларусі. Адноўленыя архітэктурныя каштоўнасці» размешчана на агароджы сталічнага парку Чалюскінцаў.

Выстава фотаздымкаў нацыянальных каштоўнасцяў скіравана на тое, каб нацыянальны скарб нікуды «не збрыў», каб не быў забыты сучаснікамі. Тое, што робяць Аляксандр Аляксееў і Алег Лукашэвіч — гэта вялікая справа, якая накіравана на захаванне і папулярызацыю беларускай адметнасці. Наша нацыя старадаўняя, мы ідзём ад Рагвалода, ад караля Міндоўга, ад Францыска Скарыны і Еўфрасінні Полацкай. Нам тысяча гадоў, і трэба памятаць пра гэта. Але каб ганарыцца, варта памятаць сваю гісторыю, праўдзівую, багатую, еўрапейскую. Нам трэба стаць не проста геаграфічным, але і духоўным цэнтрам Еўропы!

Арыгінальная выстава дапамагае пановаму ўбачыць унікальнасць айчыннай гісторыі і культуры, натхніцца беларускай архітэктурай і выбраць месцы для новых вандровак. **Адзін з аўтараў праекта, лаўрэат прэміі «За духоўнае адраджэнне» Алег ЛУКАШЭВІЧ** адзначае:

— Калі мы пачыналі наш праект у 2001 годзе, асноўнай задачай было паказаць разнастайную культурную спадчыну нашай краіны. Сведчаннем таго, што гэта работа аказалася запатрабаванай, стаў выпуск першага альбома «Спадчына Беларусі», які выйшаў у 2004 годзе і быў прададзены за месяц. Сёння, асэнсоўваючы дванаццаць гадоў, якія прайшлі з таго моманту, як мы пачыналі працаваць над праектам, мы з гонарам і годнасцю адзначаем, колькі было зроблена па аднаўленні, адраджэнні нашай спадчыны. Пятнаццаць гадоў таму не было ні ратушы ў Магілёве, ні ратушы ў Мінску, ні многіх іншых аб'ектаў. Адзін з яскравых прыкладаў такога аднаўлення — Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс, які сёння наведвае амаль паўмільёна турыстаў. Гэта сведчыць пра тое, што менавіта адноўленыя помнікі запатрабаваныя беларусамі.

На выставе пад адкрытым небам прадстаўлена больш за 100 фотавыяў адноўленых каштоўнасцяў Беларусі. І гэта далёка не ўсё архітэктурнае багацце краіны...

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

РЭПУТАЦЫЯ ЦТ ДАРАГОГА КАШТУЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У тлумачальнай запісцы да дакумента аўтары ініцыятывы напісалі, што сёння выпускнікам, каб атрымаць атэстат, неабходна здаць (на мінімальны бал) усяго толькі два адзіныя дзяржаўныя іспыты — па рускай мове і матэматыцы. Прычым з гэтымі заданнямі ў стане справіцца і паспяховы вучань пятага класа. «Калі ад выпускніка ўстановы сярэдняй агульнай адукацыі дзяржава патрабуе ўзровень ведаў, якім той валодаў у пятым класе, вучыцца становіцца неабавязкова», — падкрэсліваюць народныя абраннікі.

«Ёсць пункты правядзення ЦТ, дзе заўсёды бываюць адхіленыя ад здачы экзамену абітурыенты: і зусім не таму, што ўсе парушальнікі сабраліся менавіта ў гэтай аўдыторыі, а таму, што арганізатары ў аўдыторыі прынцыповыя і адказныя».

У сувязі з гэтым аўтары дакумента прапанавалі вярнуць у якасці выпускнога экзамену школьнае сачыненне, а экзамен па матэматыцы праводзіць у форме кантрольнай работы, якая прадугледжвае некалькі ўзроўняў складанасці. Вяртанне да традыцыйнай атэстацыі, на думку ініцыятараў паправак, павінна быць паэтапным — на працягу некалькіх гадоў, па меры гатоўнасці ўстаноў адукацыі.

Конкурс з прэтэнзіяй

Самае дзіўнае, што ў Беларусі даволі часта гучаць пытанні кшталту «А калі ж, нарэшце, і ў нас аб'яднаюць выпускныя экзамены за курс школы з уступнымі іспытамі ў ВНУ?», пры гэтым аўтары такіх ініцыятыў чамусьці забываюць, што для таго, каб расійскія ВНУ змаглі адабраць больш моцных абітурыентаў, а слабыя вучні маглі атрымаць школьны атэстат, абавязковы адзіны дзяржаўны экзамен па матэматыцы там быў падзелены на два ўзроўні: базавы (для атрымання пасведчання аб сярэдняй адукацыі) і павышаны (для тых, хто прэтэндуе на студэнцкі білет).

— Праблема ў тым, што не толькі абывацелі, журналісты, але і многія педагогі блытаюць цэнтралізаванае тэсціраванне (ЦТ) і выніковую атэстацыю і не бачаць паміж імі прынцыповай розніцы. Мы свядома захавалі на выхадзе са школы выпускныя экзамены ў традыцыйнай форме, каб не заахвочваць муштраванне па тэстах, — тлумачыць **дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мікалай ФЯСЬКОЎ**. — А задача ЦТ — складанне рэйтынгавых спісаў абітурыентаў у адпаведнасці з узроўнем іх падрыхтоўкі. Гэта фактычна конкурс сярод абітурыентаў з прэтэнзіяй на пэўнае месца, пажадана больш высокае, у агульным спісе прэтэндэнтаў. І пакуль гэта ўсе не зразумеюць, так і будуць думаць, што 30 балаў на ЦТ — гэта школьная «тройка», а 20 балаў — «двойка».

Мэта цэнтралізаванага тэсціравання — правесці конкурсны адбор. На ЦТ у аснову методыкі разліку тэставага была пакладзена стабальная шкала, якая дазваляе не толькі прыняць пад увагу колькасць правільна выкананых заданняў тэста, але і ўлічыць адносную складанасць кожнага выкананага ці нявыкананага задання. Пагадзіцеся, што ў школе складана выправіць «дзявятку» на «дзясятку», а вось дабраць хоць некалькі дадатковых пунктаў пры 100-бальнай сістэме — мэта, якая прымушае абітурыентаў працаваць.

Дарэчы, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў на пастаяннай аснове кантактуе з некаторымі ВНУ для супастаўлення школьных атэстатаў, вынікаў ЦТ і экзаменацыйнай сесіі. «Наша ацэнка ведаў маладых людзей на ЦТ і ацэнка іх ведаў падчас сесіі ў ВНУ, як правіла, супадаюць, — падкрэслівае Мікалай Фяськоў. — Уладальнікі высокіх балаў без праблем адаптуюцца да патрабаванняў вышэйшай школы. А вось у тых, хто з вялікімі цяжкасцямі пераадолеў мінімальны парог, часцей за ўсё ў працэсе навучання ўзнікаюць сур'ёзныя праблемы. Што тычыцца школьных атэстатаў, то школьныя адзнакі карэлююць з паспяховасцю студэнтаў у меншай ступені. Яно і зразумела, бо школьны бал — гэта ацэнка настаўнікам ведаў школьніка, якая пры гэтым выконвае і ролю стымулу ў навучанні, таму часта завышаецца».

Металадэтэктары не панацэя

У апошнія гады колькасць абітурыентаў, адхіленых ад удзелу ў ЦТ па прычыне парушэння ўстаноўленых правілаў, у нашай краіне змяншалася. З чым гэта звязана?

ХОПІЦЬ ТАПТАЦЬ, УПЛЯТАЦЬ, ПЕРАЯДАЦЬ!

Калі вы ясце ноччу, ясце шмат разоў на дзень, наядаецеся пасля сваркі — гэта ненармальна

Па-першае, у кожным такім выпадку прычыну трэба шукаць у харчовых паводзінах. Яны ўключаюць у сябе ўсе звычкі чалавека, звязаныя з харчаваннем: выбар часу, калі прымаецца ежа, выбар прадуктаў, у цэлым падыход да ежы. Харчовыя паводзіны адказваюць за тое, як, калі, колькі і што менавіта ўжывае чалавек. Калі вы пераядаеце, недаядаеце і г.д. — «вінаватыя» харчовыя паводзіны. Калі будзе ўсё ў норме, гэта гарантуе вам і добрую фігуру, і адсутнасць неўрозу, звязанага з ежай.

— У нашых стасунках з ежай ёсць два кампаненты — голад і харчовыя паводзіны, — кажа **ўрач-псіхатэрапеўт Мінскага гарадскога клінічнага псіхіятрычнага дыспансера Ганна ПАШНІК**. — Голад — гэта фізіялагічная патрэба, інстынкт, імпульс, прывітанне ад арганізма мозгу з паведамленнем аб тым, што патрэбна энергія. Усё астатняе — выбар прадуктаў і часу прыёму ежы, колер абруса і формы відэльцаў, размовы аб каларыйнасці і аб'ёме порцый — адносіцца да харчовых паводзінаў.

У сучасным свеце мы проста забываем аб тым, чаму ядзім, навошта наогул гэты працэс, і цалкам давяраем свой рацыён харчовым паводзінам. Гэта вялікая памылка, таму што наша харчаванне становіцца ў такім выпадку... штучным. Мы пачынаем есці, калі не прагаладаліся, а калі галодныя — трываем. Ядзім у святы праз меру, выбіраем ненатуральныя прадукты. А нам трэба памятаць, што аснова ўсяго — голад, і ўсё астатняе павінна служыць гэтай натуральнай патрэбе, каб арганізму было як мага лепш і карысней...

Аднак на практыцы мы заўважаем шмат звычак і пераваг, якія фарміруюцца ледзь не з дзяцінства. У кожнага з нашых дзеянняў, звязаных з ежай, ёсць прычына. Але адкуль жа яна? Паспрабуем разабрацца.

Выхаванне. Калі чалавек спецыяльна не працаваў над сваімі харчовымі паводзінамі, то яны на 90 працэнтаў паўтараюць звычкі яго бацькоў, тое, як прывучылі харчавацца ў дзяцінстве. Вас прывучылі да кашы раніцай — вы працягваеце яе есці, а калі і адмаўляецеся ад кашы, то замяняеце яе іншым угляводам, які аказвае на арганізм прыкладна такі ж эфект.

Традыцыі. Чалавек, які нарадзіўся ў Францыі, не будзе харчавацца так, як той, хто нарадзіўся і вырас, скажам, у Бразіліі. Гэта культурная розніца паміж традыцыйнымі кухнямі розных краін. Сюды можна аднесці і геаграфічны фактар: у рацыёне італьянца будзе шмат садавіны і алівак, у рацыёне скандынава — шмат морапрадуктаў, галандца — сыру і малочных прадуктаў. Для чалавека натуральна мець схільнасць да прадуктаў, характэрных для яго рэгіёна, нават калі па чыста смакавых якасцях яны яму і не надта блізкія.

Звычкі. Найлепшы прыклад — чай ці сок раніцай. Напрыклад, у адзін цудоўны дзень мы вырашылі, што ранішні сок — гэта добрая ідэя (карысна, дапамагае прачнуцца і г.д.). Вы пачынаеце яго піць, пакрысе прывыкаеце, і праз месяц-другі раніца без соку для вас не раніца. Тое, што звычкі так моцна ўплываюць на нашы харчовыя паводзіны, — гэта адначасова і добрая, і дрэнная навіна. Таму што, з аднаго боку, звычкі прымушаюць нас раз за разам ужываць шкодны прадукт або аб'ядацца на ноч, а з другога – мы можам выпрацаваць у сябе новую звычку, карысную, і зрабіць яе роднай.

Лад жыцця. Вельмі моцна ўплывае на харчовыя паводзіны па аб'ектыўных прычынах: напрыклад, вы позна вяртаецеся дадому з работы і сапраўды ніяк не можаце пазбегнуць позняй вячэры. Або ў вас няма перапынку на абед. Або ў вас дома няма духоўкі, і таму вы не ясце запечаных страў.

Асабістыя густы. Вы любіце вішні і ненавідзіце яблыкі; з раніцы вам кавалак у горла не лезе, затое вечарам вы жуяце да самай паўночы; вы не пераносіце гародніну, але не можаце без садавіны, і гэтак далей. Прычыны асабістых густаў часам устанавіць немагчыма: можа быць, яны з'явіліся ў дзяцінстве, магчыма, вы проста з імі нарадзіліся (нават у самых малых дзяцей ёсць свае перавагі ў ежы і свая манера есці). Тут варта адзначыць і густ вашых блізкіх. Калі ваш муж вельмі любіць мяса, а вы ставіцеся да яго нейтральна, існуе вельмі высокая верагоднасць, што з цягам часу вы таксама пачняце ўжываць больш мяса; калі ваша жонка вячэрае пераважна каля дзевяці вечара, а вы ў сем, то рана ці позна ваша вячэра таксама «спаўзе» бліжэй да дзевяці.

Псіхалагічныя фактары. Іх вельмі шмат. Гэта могуць быць наступствы нейкіх неўрозаў або псіхалагічных траўмаў: напрыклад, вы трапілі ў аўтааварыю ў той момант, калі елі віноград. Можна паспрачацца, што вы ніколі ўжо і не кінеце позірк на яго. Гэта можа быць і завышаная псіхалагічная важнасць ежы: вы ясце, калі засмучаны, каб суцешыць сябе, або, наадварот, заахвочваеце.

Не існуе азначэння таго, што такое правільныя харчовыя паводзіны. Аднак гэта можна абазначыць прыкладна такім чынам: вы ясце тады, калі адчуваеце голад; столькі, колькі неабходна для насычэння; тое, што дазваляе найлепшым чынам аднавіць энергетычны баланс і даставіць арганізму максімум карысных рэчываў. І робіце гэта з умераным задавальненнем.

Немалы спіс парушэнняў можна падзяліць **на тры асноўныя віды**.

Эмацыянальныя. Прычына пераядання хаваецца ў перажыванні нейкіх эмоцый. Напрыклад, засмучаны чалавек есць літаральна ўсё, што трапляецца, або, наадварот, не можа есці нічога. Часцей, праўда, размова ідзе пра заяданне стрэсу.

Экстэрыяльныя. Чалавек пры выбары месца, часу і тыпу ежы кіруецца не голадам ці апетытам, а знешнімі абставінамі: добрай кампаніяй, часам абеду, нізкай цаной і г.д. Такія людзі не ўмеюць адмаўляцца ад ежы і, нават калі абсалютна не галодныя, даядаюць усё да пераможнага канца (могуць і кілаграм пячэння ўмяць) і такім чынам страшна пераядаюць.

Абмежавальныя. Выражаюцца ў захапленні жорсткімі дыетамі, штучным абмежаванні ўласнага рацыёну, галаданні і г.д. Крайнія выпадкі такіх парушэнняў называюцца ў медыцыне анарэксіяй, буліміяй і псіхагенным пераяданнем. Гэты від парушэнняў вельмі небяспечны, бо чалавек, які пакутуе ад падобнага, можа давесці сябе да гібелі, ён вельмі нестабільны эмацыянальна і ставіцца да ежы як да ворага.

Нервовая булімія сустракаецца часцей, чым анарэксія, звычайна яна пачынае праяўляцца ў пачатку падлеткавага ўзросту. Для яе характэрнае пераяданне і наступнае ачышчэнне страўніка (звычайна з дапамогай слабіцельнага або рвотнага). Дыягназ выстаўляецца, калі чалавек робіць так па 2-3 разы на тыдні цягам 3 месяцаў. У некаторых выпадках стан прагрэсуе да **анарэксіі** (тэрмін азначае «адсутнасць апетыту»). Анарэксія можа быць звязана з захворваннямі, прыёмам лекаў, якія выклікаюць страту апетыту. Нервовая анарэксія ўключае псіхалагічнае непрыняцце ежы, што прыводзіць да страты 60 працэнтаў вагі. У такіх хворых парушаецца адэкватная ацэнка ўласнай вагі, узнікае страх набраць яе нават у стане моцнага знясілення.

Псіхагеннае пераяданне адрозніваецца ад буліміі тым, што ў гэтым выпадку хворы не прымае слабіцельнага для пазбаўлення ад лішніх калорый, а проста набірае вагу. Для пастаноўкі дыягназу дастаткова таго, што чалавек прымае за правіла ўжыванне 5000-15000 ккал за адзін прыём, трохразовае харчаванне і частыя перакусы.

Многія пацыенты з расстройствамі харчовых паводзінаў схільныя да **дэпрэсіі і трывогі**. Часам, калі вылечыць дэпрэсію, то можна вылечыць і расстройства харчовых паводзінаў. Чаму гэта спалучаецца, пакуль да канца не вядома. Аднак такія расстройствы сустракаюцца ў 60 працэнтаў пацыентаў з анарэксіяй і прыкладна ў 30 працэнтаў — з буліміяй. У жанчын з анарэксіяй наогул сустракаюцца назойлівыя рытуалы (узважванне кожнай порцыі, разразанне ежы на дробныя кавалкі або выкарыстанне маленькай тары для вызначэння нормы), акрамя таго, яны апантаныя дыетамі і здаровым харчаваннем.

Расстройства харчовых паводзінаў часта папярэднічае развіццю **фобіі**. Агульнымі для ўсіх тыпаў расстройстваў харчовых паводзінаў з'яўляюцца фобіі, пры якіх чалавек баіцца быць прыніжаным у грамадскіх месцах.

Часта следам за расстройствам харчовых паводзінаў узнікае **псіхічнае расстройства**. З'яўляюцца перыядычныя прыступы неспакою або страху — панічныя атакі.

У жыцці некаторых хворых з сур'ёзнымі парушэннямі харчовых паводзінаў меў месца сексуальны, фізічны або эмацыянальны гвалт, што будзе праяўляцца сімптомамі **посттраўматычнага стрэсавага расстройства**.

Лячэнне парушэнняў харчовых паводзінаў будзе заключацца ў...

...аднаўленні нармальнай вагі (для нервовай анарэксіі);

...спыненні цыклаў пераядання і ачысткі страўніка (пры нервовай буліміі);

...лячэнні фізічных ускладненняў і звязаных з імі псіхічных расстройстваў;

...прывіцці адпаведных звычак харчавання;

...рабоце па змяненні ладу думак адносна свайго харчовага расстройства;

...паляпшэнні самакантролю, самаацэнкі і паводзінаў;

...забяспечванні сямейнага кансультавання.

Акрамя псіхіятрычнай або псіхалагічнай дапамогі, вельмі важна пракансультаваць хворага па пытаннях харчавання. Пры нервовай анарэксіі ў падлеткаў асаблівую эфектыўнасць паказалі сямейныя кансультацыі, якія дапамагаюць яшчэ і бацькам правільна арганізаваць харчаванне дзіцяці. У псіхатэрапіі можа дадавацца і медыкаментознае лячэнне: існуюць прэпараты, эфектыўныя для лячэння буліміі. А вось эфектыўных пілюль для лячэння анарэксіі пакуль няма.

Вучымся гэта пераадольваць

Адзін з падыходаў да лячэння буліміі можа заключацца ў перакананні пацыента ў тым, што падманнае ўспрыманне свайго цела можна змяніць. Так, цягам 4-6 месяцаў пацыент харчуецца 3 разы на дзень, ужываючы ў тым ліку прадукты, якіх пазбягаў раней. Увесь гэты час пацыент запісвае свой штодзённы рацыён разам са звычнымі для яго нездаровымі рэакцыямі і негатыўнымі думкамі, якія прыходзяць падчас ежы. Пацыент запісвае таксама любыя пераяданні і ачышчэнні страўніка. Такія няўдачы павінны апісвацца аб'ектыўна, без самакрытыкі і асуджэння. Усё гэта рэгулярна трэба абмяркоўваць з тэрапеўтам падчас сеансаў. Урэшце прыходзіць разуменне, што створаны вобраз свайго цела з'яўляецца падманным. Як толькі ўсведамляюцца звычкі і пашыраецца набор прадуктаў харчавання, хворы пачынае спраўляцца з любымі звыклымі аўтаматычнымі думкамі і рэакцыямі. Пасля ён запавольвае іх наборам рэалістычных меркаванняў, а таксама дзеяннямі, заснаванымі на разумных чаканнях.

Ёсць і так званая інтэрперсанальная тэрапія. Яна звычайна мае справу з дэпрэсіяй і трывогай, што хаваюцца ў аснове расстройстваў харчовых паводзінаў. Гэтая тэрапія не закранае вагу, прадукты харчавання або вобраз цела наогул. Мэта яе — дапамагчы пацыенту выказаць свае пачуцці; даведацца, як пераносіць нявызначанасць і змены; выпрацаваць моцнае пачуццё індывідуальнасці і незалежнасці; звязаць сітуацыю з сексуальнымі праблемамі, нейкімі траўмуючымі, абражальнымі падзеямі, якія могуць быць першапрычынай расстройстваў харчовых паводзінаў.

Пры тэрапіі ўзмацнення матывацыі пацыенту дапамагаюць зразумець і змяніць паводзіны і стаўленне да харчавання. Гэта можа ажыццяўляцца як падчас індывідуальных, так і групавых сеансаў.

Паколькі праблема датычыцца і сям'і пацыента, важным кампанентам працэсу аднаўлення можа стаць сямейная тэрапія. Гэты падыход дапамагае ўсім членам сям'і лепш зразумець складаны характар расстройства харчовых паводзінаў, палепшыць стасункі адно з адным і навучыцца пераадольваць стрэс і негатыўныя пачуцці. Такая тэрапія можа спалучацца і з кансультаваннем па пытаннях харчавання.

■ Бацькам у дапамогу

...І СРОДАК АД КАМАРОЎ

Што сабраць з сабой дзіцяці, якое адпраўляецца ў аздараўленчы лагер?

На самай справе патрэбна не так і шмат. Галоўнае, ведаючы пра зменлівасць беларускага надвор'я, пакласці такія рэчы ды абутак, якія дапамогуць захаваць здароўе. Вялікая спартыўная сумка або заплечнік павінны замяніць шмат дробных торбаў — для зручнага самастойнага пераносу сваіх рэчаў.

Спатрэбяцца 2-3 камплекты футболак і сарафанаў, шортаў і штаноў для паўсядзённай носкі.

1-2 футболкі або сукенкі з доўгім рукавом.

Купальнік (плаўкі).

Спартыўны касцюм і закрыты спартыўны абутак.

5-6 пар шкарпэтак.

Бялізна (трусы-майкі з разлікам замены цягам не радзей як праз 2-3 дні).

Зручны абутак (дзве пары) на кожны дзень, абутак на пляж.

Піжама або начная сарочка.

2-3 світары (кофты), джынсы.

Святочнае адзенне для вячэрняга адпачынку, дыскатэкі.

Куртка (куртка-вятроўка).

Летні галаўны ўбор.

З прадметаў асабістай гігіены трэба ўзяць:

зубную шчотку і пасту, мыла туалетнае і гаспадарчае;

мачалку, шампунь, гель-душ;

расчоску, нажніцы;

вялікі рушнік для душа і пляжа.

Для дзяўчат: касметыка для догляду скуры і цела, прадметы гігіены.

Пажадана захапіць і сродак ад камароў.

Варта прасачыць, каб дзіця не прыхапіла тое, што можа яму нашкодзіць, напрыклад цыгарэты (не кажучы пра спіртныя напоі ці наркотыкі).

«Важна, каб дзіця не прывезла з сабой у аздараўленчы лагер інфекцыю або ў яго самога не пагоршылася здароўе, — нагадвае **загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ала МАЛАХАВА**. — Таму перад адпраўкай неабходна звярнуцца ў паліклініку для атрымання медыцынскай даведкі. Пры неабходнасці ўрач дасць і адпаведныя рэкамендацыі па руху, харчаванні. Дзеці з вострымі саматычнымі захворваннямі, скурнымі заразнымі і іншымі інфекцыйнымі хваробамі, педыкулёзам у лагер не прымаюцца».

У арганізаваным летніку забяспечваецца паўнацэннае разнастайнае харчаванне, якое адпавядае фізіялагічным патрэбам і ўзросту. Пітная вада, якой забяспечваюцца дзеці, — прамысловай вытворчасці, бутыляваная, або гатаваная. Таму не варта даваць з сабой харчовыя прадукты, акрамя, можа быць, пячэння, цукерак, соку ў дробнай упакоўцы і 1-2 л бутыляванай вады ў дарогу.

Якой бы фармальнасцю гэта ні выглядала, але зрабіце перад ад'ездам акцэнт на бяспечных паводзінах. Курэнне, распіванне спіртных напояў — не жарты, і гэта адназначна забаронена. Забараняецца і самастойна пакідаць тэрыторыю лагера. Варта нагадаць, што калі з'явілася дрэннае самаадчуванне, укусіў клешч, намуліў нагу або з'явіліся ваніты, млосць, дыярэя, боль у жываце, неабходна неадкладна звярнуцца па медыцынскую дапамогу або паведаміць важатаму. Папярэдзьце дзіця і аб тым, што не трэба баяцца ўдзельнічаць ва ўсіх мерапрыемствах, якія будуць праводзіцца, — спартыўных, забаўляльных, музычных. Варта спрабаваць, каб не аказацца ў ізаляцыі, і ніколі не перажываць за адмоўны вынік!

■ Едзем на прыроду

ВАЗЬМІЦЕ НА ПІКНІК

Збіраючыся на прыроду, зрабіце ўсё як належыць

Самае важнае летам — адпачыць так, каб пасля не пашкадаваць, не падарваць сваё каштоўнае здароўе, бо нават «звычайнае» атручэнне — магутны ўдар па арганізме.

— Усё, што хутка псуецца, трэба пераносіць толькі ў сумцы-халадзільніку, — нагадвае **ўрач-эпідэміёлаг Нінэль БІСКІНА**. — Бо многія прадукты і стравы могуць служыць пажыўным асяроддзем для мікробаў. Таму пакіньце дома салаты з маянэзам і смятанай, стравы з яйкамі, малочныя прадукты, вэнджаніну, пірожныя і торты з крэмам.

1. Набывайце мяса ды іншыя прадукты толькі ў стацыянарных прадпрыемствах гандлю.

2. Звярніце ўвагу на ўмовы захоўвання прадукту. Калі вы не ў стане забяспечыць такі рэжым захоўвання, не бярыце яго з сабой.

3. Выкарыстоўвайце асобныя апрацоўчыя дошкі для сырой і гатовай ежы.

4. Уся ежа павінна быць недаступнай для насякомых, грызуноў і іншых жывёл. Закрывайце яе ў кантэйнеры, абкручвайце харчовай плёнкай.

5. Выкарыстоўвайце для смажання гатовы вугаль, металічныя шампуры, а для ежы — аднаразовы посуд і сталовыя прыборы. Смажце шашлык непасрэдна перад ужываннем. Памятайце, што смажанне шашлыку на мангале не гарантуе поўнага «абеззаражвання» — бактэрыі гінуць толькі пры 70-75 градусах. Для ўпэўненасці ў бяспецы мяса дадавайце шмат спецый, якія валодаюць здольнасцю абеззаражваць — чорны і чырвоны перац, шафран, чабор, куркума, гарчыца.

6. Ніколі не забывайце пра гігіену, мыйце рукі перад гатаваннем і ўжываннем ежы. Не лішнімі будуць у дарозе вільготныя сурвэткі, гель-антысептык. Пры гэтым мыць рукі, гародніну і садавіну, а таксама посуд можна толькі бутыляванай ці гатаванай вадой. Нельга ўжываць ваду з вадаёма.

7. Усё смецце неабходна выкінуць у спецыяльна адведзеным месцы.

8. Каб пазбегнуць укусаў кляшчоў, якіх багата ў лесе, надзявайце галаўны ўбор, адзенне, якое закрывае цела, апрацоўвайце вопратку рэпелентамі, рабіце самаагляд, пазбягайце высокай травы, размяшчайцеся на адкрытых сонечных пляцоўках. Калі клешч усё ж такі ўкусіў, трэба яго выдаліць і завярнуцца да ўрача, які прызначыць прафілактычны прыём прэпарата.

9. Падчас выбару месца для адпачынку звяртайце ўвагу на ўпарадкаванне пляжа, чысціню вадаёму і дазвол на купанне ў ім.

■ Лепш папярэдзіць

БОЛЬ У СУСТАВЕ? «ЗНАСІЎСЯ» ХРАСТОК

Артроз — гэта дэгенератыўны працэс у сустаўным храстку. Ён пачынае дрэнна выконваць сваю функцыю амартызатара, бо значныя механічныя нагрузкі, якія мы забяспечваем яму цягам жыцця, станчаюць яго і разбураюць.

Здаровы храсток падчас руху сціскаецца і расціскаецца, а ў хворага эластычнасці няма, і сустаў пазбаўляецца рухавасці. Прадукты сцірання храстка выклікаюць запаленне сустава і, як вынік, абмяжоўваюць рухавасць, правакуюць ацёчнасць і боль. У працэс зносу паступова ўцягваюцца і звязкі, і мышцы, з'яўляюцца касцявыя разрастанні — астэафіты, дэфармуюцца канцы касцей, што ўтвараюць сустаў.

«Наогул, артроз можа быць абумоўлены ўзростам і полам — часцей пакутуюць жанчыны, — адзначае **ўрач-рэўматолаг 3-й цэнтральнай раённай клінічнай паліклінікі г. Мінска Іна БАШТАВАЯ**. — Значэнне мае і спадчыннасць, і наяўнасць лішняй вагі, але, па сутнасці, прычына ўзнікнення захворвання застаецца невядомай. Артроз можа развіцца таксама ў выніку іншых хваравітых станаў — пасля траўмы, унутрысустаўнога пералому, пашкоджання меніскаў, звязак або па прычыне іншага запаленчага артрыту (рэўматоіднага, гнойнага, рэактыўнага і г.д.). Праблема можа быць і ў дысплазіях, рэцыдывуючых вывіхах суставаў, эндакрынных захворваннях (цукровы дыябет), метабалічных парушэннях (падагра), хірургічных умяшаннях».

Да ўрача хворыя звычайна звяртаюцца ўжо з болем, розным па інтэнсіўнасці, які з'яўляецца пасля фізічных нагрузак і сціхае ў спакоі. І гэта прыкмета ўжо значных змен у суставе. Задоўга да гэтага хворы ўжо адчуваў і ранішнюю скаванасць у суставах, і ацёчнасць пасля цяжкай працы, і гарачку, змяншэнне рухавасці і хруст у суставе. Боль паступова нарастае, сустаў запаляецца, пачынаецца атрафія мышачнай тканкі вакол яго. **Па статыстыцы, па медыцынскую дапамогу на 1-й стадыі захворвання звяртаецца 1 % хворых, а на 3-й — ужо 81%!**

Спецыфічных для астэаартрозу лабараторных змен няма. Дыягназ пацвярджаецца на рэнтгене: на здымку відаць несіметрычнае звужэнне сустаўной шчыліны, наросты на касці, кісты, склероз косці, што прылягае да сустава.

Часцей за ўсё пашкоджваюцца пры астэаартрозе каленныя суставы (гонартроз) і тазасцегнавыя (коксартроз). На руках звычайна церпяць суставы фалангаў пальцаў. Артроз, як правіла, узнікае спачатку на адным суставе, а пасля і на другім, сіметрычным яму. Бывае нават артроз пазваночніка, таму што пазванок — таксама сустаў. З-за зрастання некаторых суставаў пры артрозе рухавасць пазваночніка таксама абмяжоўваецца.

На самых пачатковых стадыях захворванне можна «закансерваваць» з дапамогай комплекснага лячэння і змянення ладу жыцця. І гэта можна лічыць вылечваннем, бо ніякіх сімптомаў не будзе. На 2-4-й стадыях можна толькі дабівацца паляпшэння стану, але аднавіць разбураны храсток не ўдасца.

Лячэнне ў асноўным скіравана на змяншэнне болю і запалення ў суставе, зніжэнне абмежаванняў рухавасці. Прыпыніць артроз цяжка. Аднак калі комплекснае лячэнне пачата на ранняй стадыі, вынікі будуць добрымі.

Медыкаментозная тэрапія — гэта прыём анальгетыкаў, нестэроідных супрацьзапаленчых прэпаратаў, глюкакортыкастэроідаў для каля- і ўнутрысустаўнога ўвядзення. Рэкамендуюцца дыклафенак, німесулід, маваліс, напраксен, аксітэн, цэлебрэкс. Прыём унутр трэба спалучаць з мазямі, гелямі («Вальтарэн», «Фастум-гель», «Найз-гель» і інш.).

Разам з нестэроіднымі супрацьзапаленчымі прэпаратамі абавязкова прызначаюцца хондрапратэктары, якія захоўваюць, аднаўляюць клеткі храстка. Іх можна назваць базіснымі прэпаратамі, бо яны з'яўляюцца натуральнымі кампанентамі храстка. Прымаць такія прэпараты трэба працягла, але ў выніку яны запавольваюць развіццё захворвання. Гэта хандратыну сульфат, глюказаміну сульфат (структум, дона, тэрафлекс, хандрамед), гіялуронавая кіслата, алфлутоп, дыяцэрэін (дыяфлекс).

Для разгрузкі суставаў патрабуецца і артапедычная карэкцыя — вусцілкі, накаленнікі, фіксатары, палкі.

Змяншаюць ацёк, запаленне сустава, паляпшаюць кровазварот фізіятэрапеўтычныя метады: электраіндуктатэрапія, святлолячэнне, цеплавыя і халадовыя працэдуры. Масаж мышцаў знімае спазм, актывізуе кровазварот, паляпшае самаадчуванне.

Падчас абвастрэння трэба забяспечыць суставу спакой. Пасля змяншэння болю праз 3-5 дзён можна пераходзіць да пастаяннай лячэбнай гімнастыкі, якая паляпшае крыва- і лімфазварот, расслабляе мышцы, дапамагае аднавіць аб'ём руху. Неабходна чаргаваць пасіўныя згібанні-разгібанні цягам дня. Добра развітая мускулатура разгружае сустаў, так што рэгулярнасць вельмі важная.

Шырока выкарыстоўваецца і фітатэрапія — экстракт чырвонага перца, капсіцын, настой лісця крапівы пры мясцовым прымяненні, корань індыйскага жэньшэню, спіртавыя экстракты асіны і рабіны звычайнай, кораню вярбы.

На 3-4-й стадыях артрозу каленных і тазасцегнавых суставаў паказана хірургічнае лячэнне — эндапратэзаванне.

Парады ад «КЗ»

✓Харчаванне павінна быць збалансаваным. Не варта мэтанакіравана ўжываць у ежу прадукты з храсткамі жывёл, халадзец — яны ніяк не нармалізуюць метабалічныя працэсы ў сустаўных храстках чалавека, а вось павысіць узровень халестэрыну могуць.

✓Папярэджванне траўматызму, своечасовае і эфектыўнае лячэнне пашкоджанняў касцей, мышцаў — рэч вельмі неабходная ў сэнсе прафілактыкі. Той, хто шмат працуе фізічна, каму неабходна падоўгу знаходзіцца ў адной позе, павінен рэгулярна рабіць перапынкі і мяняць становішча цела.

✓Абавязкова трэба займацца фізкультурай, плаваннем.

✓Сачыце за вагой і харчаваннем. Пры лішняй вазе артрозу не пазбегнуць. Ужывайце больш садавіны, гародніны, дастатковую колькасць вітамінаў А, В, С, Д, Е, якія звязваюць і выводзяць свабодныя радыкалы, што разбураюць храсток у запаленым суставе.

✓Своечасова выпраўляйце прыроджаныя і набытыя дэфармацыі, якія змяняюць вось канечнасці і правільную функцыю суставаў (дысплазіі тазасцегнавога і каленнага суставаў, вывіхі бядра, плоскаступнёвасць і іншыя паталогіі ступні).

Матэрыялы падрыхтавала Святлана БАРЫСЕНКА. protas@zviazda.by

Паритетбанк
www.paritetbank.by

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2016 года

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Примечания	31 декабря 2015 года	31 декабря 2014 года
1	АКТИВЫ:				
2	Денежные средства	1101	5	100,947	75,413
3	Драгоценные металлы и драгоценные камни	1102	6	499	379
4	Средства в Национальном банке	1103	7	614,089	390,425
5	Средства в банках	1104	8	205,061	219,025
6	Ценные бумаги	1105	9	437,865	538,655
7	Кредиты клиентам	1106	10	1,043,083	662,281
8	Производные финансовые активы	1107		-	-
	Инвестиции в зависимые юридические лица			-	-
	Инвестиции в совместно контролируемые юридические лица			-	-
9	Долгосрочные финансовые вложения	1108	11	1,459	1,459
10	Основные средства и нематериальные активы	1109	12	328,732	140,693
11	Имущество, предназначенное для продажи	1110	13	9,384	5,963
12	Отложенные налоговые активы	1111	14	-	-
13	Прочие активы	1112	15	46,786	19,025
14	ИТОГО АКТИВЫ	11		2,787,905	2,053,318
15	ОБЯЗАТЕЛЬСТВА:				
16	Средства Национального банка	1201	16	74,926	113,908
17	Средства банков	1202	17	101,460	234,746
18	Средства клиентов	1203	18	1,645,489	1,002,612
19	Ценные бумаги, выпущенные банком	1204	19	51,922	59,055
20	Производные финансовые обязательства	1205		-	-
21	Отложенные налоговые обязательства	1206	14	-	-
22	Прочие обязательства	1207	20	5,594	109,742
23	ИТОГО обязательства	120		1,879,391	1,520,063
24	СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ:				
25	Уставный фонд	1211	22	660,556	327,936
26	Эмиссионный доход	1212		-	-
27	Резервный фонд	1213		27,399	24,510
28	Фонд переоценки статей баланса	1214	23	114,728	107,839
29	Накопленная прибыль	1215	24	105,831	72,970
	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации			-	-
	Доля неконтролирующих акционеров			-	-
30	ИТОГО собственный капитал	121		908,514	533,255
31	ИТОГО ОБЯЗАТЕЛЬСТВА И КАПИТАЛ	12		2,787,905	2,053,318

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ ЗА 2015 ГОД

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Примечания	2015 год	2014 год
1	Процентные доходы	2011		361,641	263,529
2	Процентные расходы	2012		192,806	122,411
3	Чистые процентные доходы	201	25	168,835	141,118
4	Комиссионные доходы	2021		33899	36,394
5	Комиссионные расходы	2022		7540	5,565
6	Чистые комиссионные доходы	202	26	26,359	30,829
7	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	203	27	114	-
8	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	204	28	5,238	2,252
9	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	205	29	52,994	20,707
10	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	206	30	2	-
11	Чистые отчисления в резервы	207	31	126,074	100,343
12	Прочие доходы	208	32	65,509	19,827
13	Операционные расходы	209	33	146,959	98,834
14	Прочие расходы	210	34	8,691	8,528
15	Прибыль (убыток) до налогообложения	211		37,327	7,028
16	Расход (доход) по налогу на прибыль	212		-	-
17	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)	2		37,327	7,028
	Доля в прибыли (убытке) зависимых юридических лиц			-	-
	Доля в прибыли (убытке) совместно контролируемых юридических лиц			-	-
	ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)			37,327	7,028
	Доля в прибыли (убытке) принадлежащая головной организации			37,327	7,028
	Доля неконтролирующих акционеров в прибыли (убытке)			-	-
18	Сведения о прибыли на одну акцию в белорусских рублях:				
19	Базовая прибыль на простую акцию	22	35	0.315	0.064
20	Разводненная прибыль на простую акцию	23		-	-

СВЕДЕНИЯ О КОНСОЛИДИРОВАННОМ СОВОКУПНОМ ДОХОДЕ ЗА 2015 ГОД

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Примечания	2015 год	2014 год
1	Прибыль (убыток)	301211		37,327	7,028
2	Прочие компоненты совокупного дохода	301212		6,961	9,708
2.1	В том числе: переоценка основных средств, объектов незавершенного строительства и оборудования к установке	3012121		6,464	9,708
2.2	переоценка нематериальных активов	3012122		-	-
2.3	переоценка ценных бумаг	3012123		497	-
2.4	переоценка инструментов хеджирования	3012124		-	-
2.5	переоценка прочих статей баланса	3012125		-	-
3	ИТОГО СОВОКУПНЫЙ ДОХОД	30121		44,288	16,736
	Доля в совокупном доходе, принадлежащая головной организации			44,288	16,736
	Доля неконтролирующих акционеров в совокупном доходе			-	-

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ ОБ ИЗМЕНЕНИИ СОБСТВЕННОГО КАПИТАЛА ЗА 2015 ГОД

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Уставный фонд	Эмиссионный доход	Резервный фонд	Накопленная прибыль	Фонды переоценки статей баланса	Всего собственный капитал, принадлежащий головной организации	Доля неконтролирующих акционеров	Итого собственный капитал
1	Остаток на 1 января 2014 г.	3011	327,936	-	22,623	73,091	99,228	522,878	-	522,878
1.1	В том числе: результат от изменения учетной политики и (или) исправления существенных ошибок	30111	-	-	-	-	-	-	-	-
2	Изменения статей собственного капитала	3012	-	-	1,887	(121)	8,611	10,377	-	10,377
2.1	В том числе: совокупный доход	30121	-	-	-	7,028	9,708	16,736	-	16,736
2.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	-	1,887	(1,887)	-	-	-	-
2.3	операции с учредителями (участниками)	30123	-	-	-	(6,359)	-	(6,359)	-	(6,359)
2.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	-	-	-	-	-	-	-	-
2.5	выплата дивидендов акционерам	301232	-	-	-	(6,359)	-	(6,359)	-	(6,359)
2.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	-	-	-	-	-	-	-
2.7	перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	-	1,097	(1,097)	-	-	-
2.8	прочие изменения	30126	-	-	-	-	-	-	-	-
3	Остаток на 1 января 2015 г.	3013	327,936	-	24,510	72,970	107,839	533,255	-	533,255
4	Остаток на 1 января 2015 г.	3011	327,936	-	24,510	72,995	107,839	533,255	-	533,280
5	Изменения статей собственного капитала	3012	332,620	-	2,889	32,861	6,889	375,259	-	375,259
5.1	В том числе: совокупный доход	30121	-	-	-	37,327	6,961	44,288	-	44,288
5.2	направление прибыли на пополнение фондов	30122	-	-	2,689	(2,689)	-	-	-	-
5.3	операции с учредителями (участниками):	30123	332,620	-	-	(1,649)	-	330,971	-	330,971
5.4	внесение в уставный фонд вкладов учредителей (участников)	301231	332,620	-	-	-	-	332,620	-	332,620
5.5	выплата дивидендов акционерам	301232	-	-	-	(1,649)	-	(1,649)	-	(1,649)
5.6	операции с собственными выкупленными акциями	301233	-	-	-	-	-	-	-	-
5.7	перераспределение между статьями собственного капитала	30125	-	-	200	(128)	(72)	-	-	-
5.8	прочие изменения	30126	-	-	-	-	-	-	-	-
6	Остаток на 1 января 2016 г.	3013	660,556	-	27,399	105,831	114,728	908,514	-	908,514

КОНСОЛИДИРОВАННЫЙ ОТЧЕТ О ДВИЖЕНИИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ЗА 2015 ГОД

(в миллионах белорусских рублей)

№ п/п	Наименование статьи	Символ	Примечания	2015 год	2014 год
1	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ОПЕРАЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
2	Полученные процентные доходы	70100		348,325	247,175
3	Уплаченные процентные расходы	70101		(195,544)	(120,187)
4	Полученные комиссионные доходы	70102		33,393	36,707
5	Уплаченные комиссионные расходы	70103		(7,474)	(5,390)
6	Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями	70104		114	-
7	Чистый доход по операциям с ценными бумагами	70105		5,238	2,252
8	Чистый доход по операциям с иностранной валютой	70106		33,388	(11,331)
9	Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами	70107		2	-
10	Прочие полученные доходы	70108		45,011	15,337
11	Прочие уплаченные расходы	70109		(143,628)	(95,383)
12	Уплаченный налог на прибыль	70110		-	-
13	Денежная прибыль (убыток) до изменения в операционных активах и операционных обязательствах – итого	701		118,825	69,180
14	Чистое снижение (прирост) денежных средств в Национальном банке	70200		52,223	(2,296)
15	Чистое снижение (прирост) денежных средств в банках	70201		10,714	(126,133)
16	Чистое снижение (прирост) денежных средств в ценных бумагах (кроме ценных бумаг, удерживаемых до погашения)	70202		135,860	(457,911)
17	Чистое снижение (прирост) денежных средств в форме кредитов, выданных клиентам	70203		(292,651)	54,311
18	Чистое снижение (прирост) денежных средств от производных финансовых активов	70204		-	-
19	Чистое снижение (прирост) денежных средств в прочих операционных активах	70205		5,545	42,830
20	Потоки денежных средств от изменения операционных активов – итого	702		(88,309)	(489,199)
21	Чистый прирост (снижение) денежных средств Национального банка	70300		(39,084)	30,000
22	Чистый прирост (снижение) денежных средств банков	70301		(188,226)	71,082
23	Чистый прирост (снижение) денежных средств клиентов	70302		304,990	146,821
24	Чистый прирост (снижение) денежных средств от ценных бумаг, выпущенных банком	70303		(10,545)	58,549
25	Чистый прирост (снижение) денежных средств от производных финансовых обязательств	70304		-	-
26	Чистый прирост (снижение) денежных средств в прочих операционных обязательствах	70305		(157,583)	62,585
27	Потоки денежных средств от изменения операционных обязательств – итого	703		(90,448)	369,037
28	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от операционной деятельности	70		(59,932)	(50,982)
29	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ИНВЕСТИЦИОННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
30	Приобретение основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71100		(5,496)	(4,741)
31	Продажа основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	71101		9	1,908
32	Приобретение долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71102		-	(1,443)
33	Продажа долгосрочных финансовых вложений в уставные фонды других юридических лиц	71103		-	-
34	Приобретение ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71104		(28,833)	(9,079)
35	Погашение (реализация) ценных бумаг, удерживаемых до погашения	71105		32,780	-
36	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от инвестиционной деятельности	71		(1,540)	(13,355)
37	**ПОТОКИ ДЕНЕЖНЫХ СРЕДСТВ ОТ ФИНАНСОВОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ**				
38	Эмиссия акций	72100		149,679	-
39	Выкуп собственных акций	72101		-	-
40	Продажа ранее выкупленных собственных акций	72102		-	-
41	Выплата дивидендов	72103		(1,649)	(6,375)
42	Чистый поток денежных средств, полученных (использованных) от финансовой деятельности	72		148,030	(6,375)
43	Влияние изменений валютного курса на денежные средства и их эквиваленты	73		32,442	7,295
44	Чистый прирост (снижение) денежных средств и их эквивалентов	74		119,000	(63,417)
45	Денежные средства и их эквиваленты на начало отчетного периода	740		x	191,709
46	Денежные средства и их эквиваленты на конец отчетного периода	741		310,709	x

Председатель Правления
А.С. Бриштелев
8 апреля 2016 года
Минск

Главный бухгалтер
И.Б. Сафронова
8 апреля 2016 года
Минск

Ссылка на сайт, где опубликована годовая отчетность:
http://www.paritetbank.by/about/finance/year/2015/

Лицензия Национального банка Республики Беларусь
на осуществление банковской деятельности от 27 октября 2014 года № 5

УНП 100233809

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ
по годовой консолидированной финансовой отчетности банковского холдинга Открытого Акционерного Общества «Паритетбанк» на 1 января 2016 года

Акционерам, Наблюдательному совету, Правлению Открытого Акционерного Общества «Паритетбанк».

Мы провели аудит прилагаемой годовой консолидированной финансовой отчетности Открытого акционерного общества «Паритетбанк» (далее ОАО «Паритетбанк» или «Банк») и его зависимой компании (далее – «банковский холдинг ОАО «Паритетбанк») на 1 января 2016 года.

В соответствии с Инструкцией по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507, годовая финансовая отчетность Банка состоит из:

– Консолидированного бухгалтерского баланса на 1 января 2016 года (Форма 1);
– Консолидированного отчета о прибылях и убытках за 2015 год (Форма 2);
– Консолидированного отчета об изменении собственного капитала за 2015 год (Форма 3);
– Консолидированного отчета о движении денежных средств за 2015 год (Форма 4);
– Примечаний к годовой консолидированной финансовой отчетности.

Указанная годовая консолидированная финансовая отчетность была подготовлена руководством банковского холдинга ОАО «Паритетбанк» в соответствии с Законом Республики Беларусь «О бухгалтерском учете и отчетности» от 12 июля 2013 года № 57-З, Инструкцией по составлению годовой финансовой отчетности банками и небанковскими кредитно-финансовыми организациями Республики Беларусь, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 9 ноября 2011 года № 507, Инструкцией по составлению консолидированной бухгалтерской (финансовой) отчетности банковских групп, банковских холдингов, утвержденной постановлением Правления Национального банка Республики Беларусь от 09 ноября 2011 года № 511 и другими нормативными правовыми актами Национального банка Республики Беларусь, регулирующими порядок ведения бухгалтерского учета и подготовки финансовой отчетности для банков Республики Беларусь.

Обязанности руководства аудируемого лица по подготовке годовой консолидированной финансовой отчетности

Руководство банковского холдинга несет ответственность за подготовку и представление прилагаемой годовой консолидированной финансовой отчетности в соответствии с законодательством Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности. Данная ответственность распространяется на разработку, внедрение и поддержание надлежащего функционирования системы внутреннего контроля, которая должна обеспечивать подготовку достоверной годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений в результате ошибок или недобросовестных действий; выбор и применение надлежащей учетной политики, а также обоснованных оценочных значений.

Обязанности аудиторской организации

Мы несем ответственность за выраженное нами аудиторское мнение о достоверности годовой консолидированной финансовой отчетности, основанное на результатах проведенного аудита.

Мы провели аудит в соответствии с требованиями Закона Республики Беларусь «Об аудиторской деятельности» от 12 июля 2013 года № 56-З и национальных правил аудиторской деятельности, которые обязывают нас соблюдать нормы профессиональной этики, планировать и проводить аудит таким образом, чтобы обеспечить достаточную уверенность относительно наличия либо отсутствия существенных искажений в представленной годовой консолидированной финансовой отчетности.

В ходе аудита нами были выполнены аудиторские процедуры, направленные на получение аудиторских доказательств, подтверждающих значения показателей годовой консолидированной финансовой отчетности Банка, а также другую раскрытую в ней информацию. Выбор аудиторских процедур осуществлялся на основании профессионального суждения с учетом оценки риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности в результате ошибок или недобросовестных действий. При оценке риска существенного искажения годовой консолидированной финансовой отчетности нами рассматривалась система внутреннего контроля банковского холдинга, необходимая для составления годовой консолидированной финансовой отчетности, не содержащей существенных искажений, с целью планирования аудиторских процедур, соответствующих обстоятельствам аудита, но не с целью выражения мнения относительно эффективности функционирования этой системы. Аудит также включал оценку применяемой учетной политики, обоснованности учетных оценок и общего содержания годовой консолидированной финансовой отчетности.

Мы полагаем, что в ходе аудита нами были получены достаточные и надлежащие аудиторские доказательства, которые могут являться основанием для выражения аудиторского мнения.

Аудиторское мнение

По нашему мнению, годовая консолидированная финансовая отчетность банковского холдинга ОАО «Паритетбанк», подготовленная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно во всех существенных аспектах отражает финансовое положение банковского холдинга ОАО «Паритетбанк» по состоянию на 1 января 2016 года, результаты его финансово-хозяйственной деятельности и движение денежных средств за 2015 год.

Пояснительный раздел, привлекающий внимание к аспекту

Мы обращаем внимание на пункт 36 примечаний к годовой консолидированной финансовой отчетности, в котором раскрыта информация о том, что по состоянию на 1 января 2016 года Банк не соблюдал установленный Национальным банком Республики Беларусь норматив максимального размера кредитного риска на одного должника (группу взаимосвязанных должников) по двум контрагентам. По состоянию на 1 января 2016 г. превышение норматива по контрагентам составило 38,2 процента и 0,9 процентов от нормативного капитала. На дату подписания настоящего аудиторского заключения Банк не соблюдал указанный норматив по одному контрагенту.

В соответствии с письмом Национального банка Республики Беларусь, направленным в адрес Банка, Правлением Национального банка Республики Беларусь с учетом факторов, обусловивших нарушение, и перспектив его устранения будут приниматься решения о неприменении мер надзорного реагирования за данное нарушение. Данное обстоятельство не изменяет наше аудиторское мнение.

Прочие вопросы

Годовая консолидированная финансовая отчетность банковского холдинга по состоянию на 1 января 2015 года была проверена другой аудиторской организацией, аудиторское заключение которой датировано 9 апреля 2015 года и содержит аудиторское мнение без оговорок.

Теляк Елена Владимировна
Директор Унитарного предприятия «ПрайсвотерхаусКуперс Эшуранс»
Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 767 от 20 мая 2003 г., без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 19 от 10 сентября 2008 г., без ограничения срока действия (дата последнего тестирования – 19 июня 2015).

Туровец Ольга Сергеевна
Ведущий аудитор Унитарного предприятия «ПрайсвотерхаусКуперс Эшуранс»
Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 2182 от 26 ноября 2013 года, без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 77 от 19 июня 2014 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования – 5 июня 2014).

Апарович Алеся Николаевна
Ведущий аудитор Унитарного предприятия «ПрайсвотерхаусКуперс Эшуранс»
Квалификационный аттестат аудитора Министерства финансов Республики Беларусь № 1183 от 15 ноября 2004 года, без ограничения срока действия.
Свидетельство о соответствии квалификационным требованиям, предъявляемым к специалистам, осуществляющим аудиторскую деятельность в банках и небанковских кредитно-финансовых организациях № 48 от 7 октября 2009 года, без ограничения срока действия (дата последнего тестирования – 18 сентября 2015).

Дата подписания аудиторского заключения: 8 апреля 2016 года.
Место выдачи аудиторского заключения: г. Минск, Республика Беларусь.
Дата получения аудиторского заключения аудируемым лицом: 8 апреля 2016 года.

Председатель Правления ОАО «Паритетбанк»
Бриштелев Андрей Степанович

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г.Витебск, проезд Гоголя, 5, тел. (0212) 42-61-62.

Продавец: Открытое акционерное общество «Витебские продукты» 210041, г. Витебск, ул. Воинов-Интернационалистов, 25, тел. +375 29 711-18-95.

Лот №1. Капитальное строение с инв.№200/С-52577 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Суворова, д. 12 площадью 508 кв.м, назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административное здание, на зем.участке с кадастровым № 240100000001000329 площадью 0,0526 га, здание является памятником архитектуры 2-й категории. Капитальное строение с инв.№200/С-96657 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, тепловая сеть к зданию №12 протяженность 28,1 м, наименование: тепловая сеть. Нач.цена (до/после деноминации): 10 463 730 000/1 046 373 белорусских рублей без НДС. Задаток (до/после деноминации): 1 046 373 000/104 637,30 бел.руб.

Лот №2. Изолированное помещение с инв.№200/D-92048 по адресу: Витебская обл., г.Витебск, ул. Пролетарская 1-я, д.10 площадью 1154,9 кв.м, наименование: столовая, назначение: помещение общественного питания. Нач.цена (до/после деноминации): 812 644 470/81 264,45 рублей без НДС. Задаток (до/после деноминации): 81 265 000/8 126,50 бел.руб.

Аукцион состоится 11.07.2016 в 15.00 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатков и приема документов: с 08.06.2016 с 8.30 по 08.07.2016 до 17.30. Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней со дня проведения аукциона. Условие аукциона: оплатить предмет аукциона в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС сверх цены продажи объекта, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и затраты по оценке имущества, по лоту №1 заключить охранное обязательство в течение одного месяца с момента приобретения прав на объект недвижимости.

Заявления на участие в аукционе со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г.Витебск, проезд Гоголя, д.5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Аукцион проводится в порядке, установленном Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 № 609. Лица, желающие участвовать в аукционе, обязаны подать организатору аукциона заявление на участие в аукционе, подписать соглашение установленной формы с приложением документов: документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр.лицом или индивидуальным предпринимателем РБ - копия документа, подтверждающего гос.регистрацию юр.лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр.лицом - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр.статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем - легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица РБ – доверенность (кроме случаев, когда юр.лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя РБ - нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр.лица, иностранного физ.лица или индивидуального предпринимателя - доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, руководитель юр.лица - документ, подтверждающий его полномочия. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) обязан перечислить затраты на организацию и проведение аукциона, возместить затраты по оценке имущества на расчетный счет, указанный в протоколе аукциона в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. **Задаток перечисляется на р/с 3012078870010, ЦБУ №2 ЗАО «МТБанк», г.Витебск, ул.Ленина, 17, БИК 153001117, УНП 390477566, получатель платежа ККУП "Витебский областной центр маркетинга".** Организатор аукциона вправе в любое время, но не позднее, чем за 3 дня до даты проведения аукциона, отказаться от проведения аукциона. Дополнительную информацию можно получить по тел: (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.

УНП 500021638

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

17 июня 2016 года состоится
внеочередное общее собрание акционеров
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш», расположенного по адресу:
г. Лида, ул. Советская, 70 в 12.00 (конференц-зал)
(собрание проводится в очной форме)

Повестка дня собрания:

1. Об увеличении уставного фонда ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» путем эмиссии акций дополнительного выпуска, передача акций дополнительного выпуска в собственность Республики Беларусь.
2. Утверждение решения об эмиссии акций дополнительного выпуска.
3. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш» и утверждение его в новой редакции.

Наблюдательный совет
ОАО «Управляющая компания холдинга «Лидсельмаш»

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА НА ПРАВО ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ

УНП 201003265

Аукцион состоится **12 июля 2016 года в 14.00** по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21 в малой студии Брестского филиала РУП «Белтелеком».
Организатор аукциона — РУП «Белтелеком» в лице Брестского филиала, расположенного по адресу: г. Брест, пр. Машерова, 21.
На аукцион выставляется право заключения договора аренды недвижимого имущества, которое представляет собой:

Лот №1:
Помещения изолированного помещения, изолированного помещения №2, общей площадью 23,5 кв. м (20,0; 3,5) в г. Бресте, пр. Машерова, 21—2, 4-й этаж.

Срок аренды – 5 лет, начальная цена продажи права – 5,875 базовых арендных величин, размер задатка – 0,5875 базовых арендных величин, согласно п.8.2 Положения о порядке определения размера арендной платы, утвержденного Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 №150, установить коэффициент – 3,0; целевое использование – для производственных целей (за исключением вредных производств), размещения офиса, складского помещения, оказания услуг, осуществления розничной торговли.

Документы на участие в аукционе по объекту: Помещения изолированного помещения в г. Бресте, пр. Машерова, 21—2, 4-й этаж принимаются с 10 июня 2016 года по 11 июля 2016 года в рабочее время с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 224030, г. Брест, пр. Машерова, 21, каб. № 416.

Для участия в аукционе участник аукциона в срок, установленный для приема документов:
-перечисляет задаток на с/сч 3012100110001 филиала №100 Брестского областного управления АСБ «Беларусбанк» МФО 246, УНП 201003265;
- подает заявление на участие в аукционе;
- заключает соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона;
- предоставляет копию платежного документа о перечислении задатка.

Помимо указанных документов:
- физическое лицо предъявляет документ, удостоверяющий личность;
- индивидуальный предприниматель – копию свидетельства о государственной регистрации;
- юридическое лицо (резидент Республики Беларусь) - копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; нерезидент - легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.

Представитель физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица предъявляет доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.

Копии документов предоставляются без нотариального засвидетельствования.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену за предмет аукциона.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 3-х рабочих дней со дня проведения аукциона **обязан**:

1) в установленном порядке перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка;

2) возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах на организацию и проведение аукциона, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом аукциона под роспись;

3) заключить договор аренды по результатам аукциона в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

В случае отказа или уклонения участника аукциона, ставшего победителем аукциона (единственным участником аукциона), от выполнения следующих обязанностей – подписания протокола о результатах аукциона; оплаты суммы, по которой продано право заключения договора аренды; возмещения затрат на организацию и проведение аукциона; заключения договора аренды:

участник аукциона, ставший победителем аукциона (единственным участником аукциона), **уплачивает штраф** в размере 15% от начальной цены продажи объекта.

Если при проведении аукциона участник аукциона вместе с другим(и) участником(ами) аукциона согласится с объявленной аукционистом ценой, но ни один из них не согласится со следующей объявленной аукционистом ценой и после предложения аукциониста этим участникам аукциона объявить свою цену, которая должна быть выше последней цены, с которой согласились участники аукциона, ни один из этих участников не предложит свою цену, в результате чего аукцион будет признан нерезультативным, участник аукциона **уплачивает штраф** в размере 15% от начальной цены продажи объекта.

Порядок оформления участия в аукционе, а также порядок проведения аукциона определены Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Телефон для справок: (8-0162) 20-28-88, 22-10-20, факс 22-15-42.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ ПО ПРОДАЖЕ АВТОМОБИЛЯ:

Лот №1 — легковой джип SUZUKI GRAND VITARA номер кузова JSAJTDB4V00101398 с дополнительным комплектом летних шин (4 шт.). Г.в. — 2008. Двигатель — бензиновый, инжекторный, объем – 3 195 см³.

Автомобиль не на ходу, поврежденный (в аварийном состоянии). Адрес: г. Минск, ул. Брестская, 42.

Начальная цена с НДС – 66 239 912 бел. руб. Задаток – 10 000 000 бел. руб. Шаг аукциона — 5 %.

Задаток перечисляется на р/с № 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже автомобиля РУП «Институт недвижимости и оценки», проводимом 20 июня 2016 г.

Победитель аукциона либо — в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), — Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен оплатить стоимость приобретенного на аукционе Объекта в течение 5 (пяти) банковских дней с момента заключения договора купли-продажи Объекта.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат по организации и проведению повторного аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится 20.06.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 16.06.2016 до 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 6. Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звяз

■ Невядомае пра вядомых

ВЯЛІКІ ТАЛЕНТ, ВЯЛІКАЯ ТАЯМНІЦА

Постаць Кузьмы Чорнага – вачыма сучаснікаў, вучняў і нашчадкаў

Яго называюць першым раманістам у беларускай літаратуры, а таксама — нашым Дастаеўскім і нашым Стэйнбекам. Удумлівы апавядальнік і глыбокі псіхолаг, Кузьма Чорны (сапраўднае імя Мікалай Раманоўскі) за свой кароткі жыццёвы век здолеў у раманах адлюстраваць лёсы некалькіх пакаленняў беларусаў, стаць у шэраг нацыянальных класікаў, а таксама ўзняць айчынную прозу на сусветны ўзровень. Але ці шмат мы ведаем пра самога пісьменніка, яго жыццёвую дарогу? Напэўна, не. Таму кніга «Кузьма Чорны. Чалавек — гэта цэлы свет», што выйшла ў свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў межах знакамітай серыі «ЖЗЛБ», стане для айчыннага чытача адкрыццём. Перадусім — адкрыццём асобы класіка. Пра тое, якія матэрыялы ўвайшлі ў гэтае выданне, як ішла праца над праектам мы гутарым з укладальніцай кнігі, загадчыкам аддзела літаратурна-мастацкіх праграм Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё Галінай ШАБЛІНСКАЙ.

Кузьма Чорны з дачкой Рагнедай, 1938 г., фота з сямейнага архіва Міколы Раманоўскага.

— Галіна Васілеўна, вы ўжо выступалі ў якасці ўкладальніка кніг серыі «Жыццё знакамітых людзей Беларусі». Склалі тамы, прысвечаныя Янку Купалу і Уладзіміру Караткевічу. Чаму менавіта Кузьма Чорны цяпер прыцягнуў вашу ўвагу?

— Постаць Кузьмы Чорнага мяне цікавіла даўно. Здавалася б, хрэстаматыйны аўтар, але мы ведаем пра яго да крыўднага мала. Вельмі хацелася паглыбіцца ў той час, які спраўдзіў Чорнага як мастака і разам з тым не даў яму цалкам рэалізавацца. Вялікі талент — гэта заўсёды вялікая таямніца. І мяне кожны раз дзівіць тая сіла супрацьстаяння часу, абставінам, лёсу, якой валодаюць таленавітыя людзі (на жаль, не ўсе). Я, можа, выкажу парадаксальную думку, але Купала, Караткевіч і Чорны — блізкія ў выяўленні свайго боскага творчага дару. Паглядзіце, у кожнага з іх — кароткі зямны век: 60, 54 і 44 гады адпаведна. Яны перажылі палітычныя ўціскі свайго часу, а то і рэпрэсіі, і праз усе выпрабаванні — такое ахвярнае служэнне беларускаму слову і Бацькаўшчыне. Мы вымаўляем гэтыя імёны і чуем — Беларусь. У лёсе кожнага з іх ключавое слова — мужнасць. І да Чорнага яно стасуецца ў асаблівай ступені.

— Якія крыніцы матэрыялаў выкарыстоўвалі ў працы? У якіх архівах, бібліятэках працавалі?

— Тут я хацела б падкрэсліць, што мэта гэтага выдання — расказаць пра Кузьму Чорнага як чалавека, прасачыць лінію жыцця творцы. Таму ў кнізе пераважае мемуарны жанр. І канешне, галоўныя апавядальнікі яго жыццёвай і творчай біяграфіі — сучаснікі пісьменніка. Іх успаміны параскіданы па самых розных крыніцах, у тым ліку — шмат у перыёдыцы, пачынаючы з пасляваенных гадоў. Па сутнасці, гэта былі першыя эмацыянальна-балючыя водгукі светлай памяці Чорнага, які памёр у лістападзе 1944 года.

«Гэтую кнігу трэба браць ў рукі і чытаць. Яна, сапраўды, адкрывае нам невядомага класіка, набліжае яго постаць і ўзвышае».

А працаваць даводзілася ў розных месцах. Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва, аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінская абласная бібліятэка імя А.С. Пушкіна, іншыя архіўныя і музейныя ўстановы. Нават у фондах Беларускага радыё я знайшла некалькі цікавых успамінаў пра Кузьму Чорнага, якія былі запісаны яшчэ ў 1960–1970-я гады: Алеся Пальчэўскага, Антона Бялевіча, Міколы Хведаровіча ў выкананні аўтараў. Потым я прачытала надрукаваныя варыянты і калі іх супаставіла, аказалася, што аўдыёзапісы — больш родныя.

— Многія дакументы, фотаздымкі, што ўвайшлі ў кнігу, праўды ўнікальныя, яны дадаюць новыя рысы да асобы Кузьмы Чорнага. Што менавіта для вас было нечаканасцю, адкрыццём у постаці і лёсе класіка?

— Сышла забранзавеласць класіка, і адкрылася жывая асоба з любоўю, болем, роздумам, пакутамі. Нават яго партрэт на супервокладцы кнігі, калі вы звярнулі ўвагу — зусім не падобны на тыя зарэтушаваныя, што мы бачылі раней. Хтосьці з маіх калег сказаў — твар еўрапейскага класіка. А Кузьма Чорны і ёсць такім.

Вядома, што 8 месяцаў турмы моцна падарвалі здароўе Чорнага і скарацілі яго век, але ўражвае тая прага да працы, якая ніколі яму не здраджвала, ні пры якіх жыццёвых абставінах. Якую сілу волі трэба было мець і якое жаданне пісаць, каб працаваць да апошняга ўздыху і верыць у тое, што ты робіш. І гэты яго апошні запіс у дзённіку, зроблены ў дзень смерці: «Божа, напішы за мяне мае раманы, хіба так маліцца, ці што?..», які цяпер часта цытуюць, гучыць як прысуд пісьменніцкага лёсу, той Галгофы, якую ён прайшоў...

«Іван Мележ лічыў яго сваім настаўнікам, талент празаіка Кузьма Чорны разгледзеў у зусім яшчэ маладога Янкі Брыля».

— А якія дакументы, здымкі мы бачым у кнізе ўпершыню?

— Некалькі фотаздымкаў з сямейнага архіва, аўтографы лістоў Чорнага да Пятра Глебкі, Адама Бабарэкі, Якуба Коласа, дароўныя надпісы пісьменніка на яго кнігах, рукапіс верша Юркі Гаўрука «Памяці Кузьмы Чорнага» 1945 года, фотаздымак пасмяротнай маскі пісьменніка. Асабіста мяне вельмі крануў дакумент з сямейнага архіва, які падрыхтаваў да друку ў гэтай кнізе ўнук Мікола Раманоўскі. Гэта «Хроніка хваробы Кузьмы Чорнага» — запісы жонкі Рэвекі Свераноўскай, якія былі зроблены ёю, калі ў Чорнага здарыўся першы інсульт у канцы 1942 года ў Маскве. І ліст дачкі пісьменніка Рагнеды да Якуба Коласа, які быў напісаны дзяўчынкай-падлеткам таксама недзе ў гэты перыяд (пісьмо без даты). Яго нельга чытаць без хвалявання. Пра ўсё не раскажаш. Гэтую кнігу трэба браць у рукі і чытаць.

— Наколькі плённай была супраца з унукам Чорнага, перакладчыкам Міколам Раманоўскім?

— Я ўдзячна спадару Міколу за дапамогу ў падрыхтоўцы гэтай кнігі. Ён вельмі адказна паставіўся да маёй прапановы «зазірнуць у сямейны архіў». Спадар Мікола вельмі беражліва, я б сказала, расчытаў запісы сваёй мамы Рагнеды Мікалаеўны «Мінулае», яны друкуюцца ўпершыню. Ім былі падрыхтаваны лісты Кузьмы Чорнага, якія захоўваюцца менавіта ў сямейным архіве, і гэта зноў — адкрыццё для чытача. Ён шчодра прапанаваў нам матэрыял для ілюстрацыйнага афармлення выдання, шмат цікавага расказаў пра свой род у інтэрв'ю. Мне імпануюць яго адносіны да справы ўшанавання памяці пра дзеда.

— Многія з пісьменнікаў-сучаснікаў успамінаюць пра Чорнага як пра вельмі тактоўнага настаўніка-дарадцу. Пішуць, што ён з цярплівасцю чытаў іх творы, рабіў слушныя заўвагі, нават хворы працаваў і запрашаў іх дадому ў новую кватэру па вуліцы Свярдлова. Якім творцам Кузьма Чорны даў путцёўку ў вялікую літаратуру?

— Фактычна, гэта ўсё маладзейшае пакаленне, якое прыйшло ў беларускую літаратуру пасля Кузьмы Чорнага ў 1920-я і 30-я гады. Нездарма яго называлі хросным бацькам літаратурнай моладзі. Іван Мележ лічыў яго сваім настаўнікам, талент празаіка Кузьма Чорны разгледзеў у зусім яшчэ маладога Янкі Брыля. Алесь Пальчэўскі, Антон Бялевіч, Іван Грамовіч, Павел Пруднікаў, Рыгор Няхай, Мікола Хведаровіч, Усевалад Краўчанка, Уладзімір Хадыка — спіс можна доўжыць. Праца з творчай моладдзю — гэта асаблівы дар, а ў Чорнага не было «дзяжурнага» стаўлення да маладых, усё ішло ад сэрца, і яны гэта цудоўна адчувалі.

— Ёсць у выданні і лісты пісьменніка да яго сяброў і паплечнікаў — Васіля Віткі, Пятра Глебкі, Пімена Панчанкі, Адама Бабарэкі і многіх іншых. Ці сапраўды Кузьма Чорны прыцягваў да сябе людзей?

— Так, цэлы раздзел у кнізе прысвечаны ліставанням Чорнага з рознымі людзьмі. Вядома, што пісьмаў пісьменніка ўвогуле захавалася не так і шмат. Тым больш, я думаю, будзе цікава прачытаць іх у гэтай кнізе. А пра тое, што Чорны валодаў магнетызмам прыцягваць да сябе людзей, згадваюць многія. Гэта зайздросны талент глыбокіх натур. Хоць на пустыя размовы марнаваць час не хацеў. Інакш бы ён не паспеў столькі напісаць.

— Наколькі гучным было яго імя ў свой час, а меркаванне — аўтарытэтным?

— Гэта было адно з самых яркіх імёнаў у свой час. Да яго думкі заўсёды прыслухоўваліся, у сваіх крытычных ацэнках ён не крывадушнічаў, а густу і таленту яму было не пазычаць. І Чорнаўскае «будзе друкавацца» для маладых гучала як пароль, як надзея, што яны абавязкова будуць працаваць у беларускай літаратуры.

— У некаторых рукапісах, вывезеных з Беларусі, пісьменнік паўстае і ў вобразе мастака. Тут ёсць малюнкі, накіды ілюстрацый. А як сам Кузьма Чорны ставіўся да сваіх мастакоўскіх эксперыментаў?

— На жаль, такой інфармацыяй я не валодаю. Магу толькі меркаваць, што яму было цікава ілюстраваць уласныя творы. У гэтым таксама выяўлялася яго творчая натура. Шкада, што мала захавалася малюнкаў. Таленавітыя людзі — таленавітыя ва ўсім... Дарэчы, Кузьма Чорны быў і музычна адораным чалавекам.

— Раман Чорнага «Пошукі будучыні» не так даўно быў выдадзены ў серыі «Мая беларуская кніга», выбраныя творы ва ўкладанні Міхася Тычыны выйшлі на пачатку 2000-х у серыі «Беларускі кнігазбор», а збор твораў класіка ў 8 тамах пабачыў свет аж у 1970-я. Ці ёсць патрэба ў новым зборы твораў?

— Сюды можна таксама дадаць том твораў Чорнага ў «Залатой калекцыі беларускай літаратуры», які выйшаў летась у «Мастацкай літаратуры». Быў пазнейшы збор твораў класіка ў 6 тамах, у 1990-я гады. І тым не менш патрэба, як вы кажаце, у новым зборы твораў Кузьмы Чорнага ёсць. Пра што, дарэчы, гаворыць у гэтай кнізе і ўнук пісьменніка Мікола Раманоўскі.

— Можна сцвярджаць, што творы Чорнага могуць здабыць новую хвалю папулярнасці і быць наноў адкрытымі нашымі сучаснікамі?

— Класічныя творы, як вядома, пішуцца «навыраст». І новае прачытанне класікі адбываецца ў кожнага пакалення. Спадчына Кузьмы Чорнага вяртае нас да спрадвечнага: зямля, чалавек, свет. І колькі будзе жыць чалавек на зямлі, ён будзе шукаць сваё месца ў гэтым свеце, будзе любіць свой дом і свой край, каб зразумець і спраўдзіць сваё «я».

Марына ВЕСЯЛУХА.
vesialuha@zviazda.by

А як унук пісьменніка ўспрыняў новую кнігу, якая распавядае пра яго дзядулю? Якія выданні пра Чорнага яму хацелася б пабачыць і якія адкрыцці ў вывучэнні жыццёвай дарогі класіка нас яшчэ чакаюць? На гэтыя пытанні адказвае ўнук Кузьмы Чорнага Мікола РАМАНОЎСКІ:

— Новая кніга грунтоўная і добра выдадзеная. Успамінаў за дзесяцігоддзі набралася шмат, але ўсе былі раскіданыя па розных выданнях; лісты не былі сабраныя дагэтуль ніколі, крытыка — таксама. Дзякуй укладальніцы, дызайнеру, выдаўцам. Пашкадаваць можна хіба пра тое, што аб'ём не бязмежны і не ўсё ўдалося ўключыць. Прыкладам, не ўвайшлі дзённікі і фрагменты з лістоў Васіля Віткі ваеннага часу, а гэта (асабліва дзённікі) — унікальныя сведчанні пра тое, як жыла рэдакцыя газеты «Савецкая Беларусь», дзе працаваў дзядуля, на пачатку вайны вандруючы па расійскіх гарадах, а потым атабарыўшыся, некаторыя фотаздымкі і лісты — Чорнага і іншых асоб; мемуарныя запісы Рагнеды Раманоўскай (дачкі); колькі шпітальных запісаў самога Чорнага дзённікавага характару. Мабыць, упершыню ў добрай якасці публікуюцца факсіміле рукапісаў.

Увага да спадчыны Чорнага сёння недастатковая, дый, зрэшты, не толькі да яе. Але перыядычна сустракаю ў інтэрнэце, як той ці іншы чалавек піша, што чытае Чорнага, — і як жа добра, ці шукае парады, што значаць у Чорнага тыя ці іншыя словы і выразы. Вось такая цікавасць «знізу» надзвычай каштоўная.

Што да пакуль не апублікаваных матэрыялаў, пра якія мне вядома, то яны цікавыя хутчэй не для даследчыка творчасці, а для біёграфа: афіцыйныя паперы, запісы з нататніка... Мастацкія творы апублікаваныя ўсе, якія толькі захаваліся, нават, здаецца, з лішкам (перадрукоўваўся пад імем Чорнага, але не ўвайшоў у зборы твораў верш, напісаны, пэўна, нейкім ягоным фамільятам, бо сам ён вершаў не пісаў ніколі). Застаюцца неапублікаванымі два пераклады п'ес (Астроўскага і Горкага), неперадрукаванымі ў нашы дні — астатнія пераклады. У зборы твораў у 8 тамах 1970-х гадоў была апублікаваная хроніка жыцця і творчасці Чорнага, але цяпер яе трэба рабіць фактычна нанава: за савецкім часам шмат пра што і пра каго немагчыма было згадаць.

Таму, мне здаецца, не хапае найперш поўнага збору твораў Кузьмы Чорнага — з лістамі, перакладамі, нанава зверанага з першадрукамі і рукапісамі. Не хапае электроннага выдання — дагэтуль у інтэрнэце толькі адзінкавыя аповесці і апавяданні. Не хапае слоўніка мовы Чорнага . Ёсць багата біяграфічных матэрыялаў, але грунтоўнай біяграфіі няма. Дарэчы, Чорным жа займаліся не толькі літаратуразнаўцы, а і мовазнаўцы, літаратуразнаўчая анталогія ў новай кнізе прадстаўленая, а мовазнаўчую яшчэ, мабыць, варта сабраць. Страшэнна расчароўваюць пераклады Чорнага на рускую мову, якія рабіліся за савецкім часам. Мова там прадказальна знявеляваная, да таго ж шмат павыкрэслівана. Ніякага ўяўлення пра тое, за што ў нас цэняць Чорнага, гэткія пераклады даць не могуць. А рабіць нанава — гэта вялікі выклік для перакладчыка, бо трэба фактычна ствараць з нуля расійскі адпаведнік чорнаўскаму стылю. Пры тым, што беларуская і руская стылістыка збудаваныя зусім па-рознаму.

Рэдкалегія часопіса «Узвышша». Сядзяць: Кузьма Чорны, Уладзімір Дубоўка, Кандрат Крапіва. Стаяць: Адам Бабарэка, Язэп Пушча. Мінск, 1927 г., фота з фондаў Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	4.39	21.39	17.00
Віцебск	4.21	21.37	17.16
Магілёў	4.29	21.29	17.00
Гомель	4.35	21.16	16.41
Гродна	4.56	21.52	16.56
Брэст	5.06	21.44	16.38

Месяц

Маладзік 05.06–11.06.
Месяц у сузор'і Льва.

Імяніны

Пр. *Алены, Георгія, Івана, Макара.*
К. *Ады, Ядвігі, Вільгельма, Максіма.*

ЗАЎТРА



…у суседзяў

ВАРШАВА	+20..+22°С	КІЕЎ	+21..+23°С	РЫГА	+14..+16°С
ВІЛЬНЮС	+16..+18°С	МАСКВА	+13..+15°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+9..+11°С

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Пырнік, снітка, макрыца, асот — «гарачая пяцёрка» самых трывалых

ЗМАГАННЕ З ПУСТАЗЕЛЛЕМ: ЯК ПЕРАМАГЧЫ САМЫХ ЖЫВУЧЫХ

Асот

Мабыць, самая непрыемная для праполкі расліна. Перашкаджаюць і калючае сцябло, і магутны корань даўжынёй да 18 см. А калі спазніцца з праполкай, то насенне-лятучкі за адзін сезон засеюць увесь участак!

Спосабы барацьбы

Механічныя. Звычайная праполка патрабуе сілы (выцягваць корань з зямлі), садовых пальчатак і педантычнасці — бо калі вы пакінеце ў зямлі хоць бы пяцісантыметровы кавалачак кораня, пустазелле хутка зноў адрасце. На ўчастках, якія не вельмі кідаюцца ў вочы, можна не палоць, а метадычна касіць пустазелле, гэта знясіліць яго.

Народныя. Замульчыруйце глебу — пілавіннем, саломай, плёнкай. Міжраддзі і прастору пад дрэвамі можна засланіць спецыяльным матэрыялам — аграспанам (гэта чорная тканіна, якая перашкаджае з'яўленню пустазелля).

Хімічныя. Знішчыць асот дапамогуць «Раўндап» або «Латрэл». Праўда, прымяняць іх варта толькі на газонах, уздоўж плота і дарожак. Не дапускайце пападання хімікатаў на лісце і парасткі культурных раслін!

Снітка

Сапраўднае бедства для саду. З дапамогай доўгіх жывучых каранёў хутка размнажаецца і асвойвае ўсё новыя і новыя плошчы. Праполка бескарысная — расліна пранізвае каранямі 40-сантыметровы пласт глебы! І дае парасткі з найменшага кавалачка кораня.

Спосабы барацьбы

Механічныя. Поўнае глыбокае перакопванне пласта глебы, кожны корань трэба выбраць. Распаўсюджванне сніткі можна стрымліваць, укапаўшы ў зямлю пластыкавую садовую стужку на глыбіню не менш за 20 см. А каб расліна не размнажалася самасевам, трэба касіць траву і абрываць кветканосы.

Народныя. Рэкамендуецца да вясны наступнага года прыкрыць чорнай плёнкай, кардонам або аграспанам моцна заражаныя ўчасткі. Без сонечнага святла большасць раслін загіне. Другі спосаб — пасадзіць бульбу (снітка не выносіць абгонкі).

Хімічныя. Супраць сніткі рэкамендуюць прэпараты «Раўндап», «Кілер», «Тарнада». Толькі апрацоўваць жывучае пустазелле давядзецца некалькі разоў за сезон. Праводзіць «хімічную атаку» лепш ясным бязветраным днём. Сцеражыцеся пападання прэпаратаў на лісце і парасткі дэкаратыўных і ядомых раслін.

Макрыца

Пустазелле-індыкатар, паказвае, што глеба на вашым участку занадта кіслая, ды і сонца на ўчастку замала. Дзякуючы жывучасці пустазелля змагацца з ім даводзіцца ўсё лета. Макрыца пастаянна цвіце і здольная змяніць некалькі пакаленняў за сезон.

Спосабы барацьбы

Механічныя. Выполваць гэтую няпрошаную госцю вельмі складана. Нават маленькі лісточак або кавалачак сцябла, што застаўся ў зямлі, здольныя вельмі хутка даць новую расліну. Тонкае сцябло рвецца пры праполцы і яшчэ лепш укараняецца, а праз некалькі тыдняў з'яўляюцца новыя ўсходы. Ссякайце зелле матыкай або пласкарэзамі, як толькі заўважыце. Галоўнае — не дапускаць цвіцення!

Народныя. Прасцей за ўсё стварыць пустазеллю невыносныя ўмовы: восенню пры перакопванні ўнесці ў глебу вапну або мел, попел. Попел можна ўжываць у любы час. Такі спосаб значна знізіць кіслотнасць, і макрыца пакіне ўчастак сама сабой.

Хімічныя. Цалкам знішчае макрыцу «Раўндап». Выкарыстоўваючы хімікат, дакладна прытрымлівайцеся інструкцыі, захоўвайце бяспечную дазіроўку і правілы апрацоўкі. Улічыце — «хімію» нельга прымяняць на градках і ў пладовым садзе, хіба толькі восенню падчас перакопкі.

Пырнік паўзучы

Неверагодна ўпартая расліна, якая выжывае ў любых умовах. А прычынай усяму карані, якія пранікаюць на глыбіню да 1 м. Адна расліна здольна даць 10 000 зярнятак насення, якое прарастае ўжо праз два тыдні. Пырнік завабліве ў агарод шкодных насякомых — драцяніка, гесенскую муху і сцябловую соўку.

Спосабы барацьбы

Механічныя. Лепшы спосаб знішчэння пустазелля — гэта перакапаць участак віламі на вельмі вялікую глыбіню (да 30 см) і старанна прыгэтым выбраць рукамі карані. Нават маленькі адростак можа засмеціць увесь агарод. Выпалатыя расліны вынесіце за тэрыторыю і спаліце.

Народныя. Вельмі добра прыгнятае пырнік газонная трава. Моцна заражаныя ўчасткі рэкамендуюць заняць пад газон або проста засеяць канюшынай. Можа дапамагчы і мульчыраванне — пілавіннем, саломай, аграперлітам (пакідаючы крыжападобныя прарэзы для карысных культур).

Хімічныя. У ясную пагоду апырскваюць пустазелле «Раўндапам». Калі расліны пажоўкнуць (праз 7-10 дзён), перакопваем глебу і выдаляем карані. На газоне, дзе пустазелля няшмат, прэпарат можна наносіць пэндзлікам. «Хімія» не павінна трапіць на лісце і парасткі культурных раслін.

Даты Падзеі Людзі

8 ЧЭРВЕНЯ

1781 год — 235 гадоў таму нарадзіўся Юзаф Дашчынскі, беларускі піяніст, кампазітар, дырыжор, педагог. Пачынаючы з 1813 года выкладаў музыку ў Віленскім універсітэце. У 1814-м пераехаў у Гарадзішча пад Мінскам, дзе амаль 30 гадоў узначальваў сімфанічны аркестр, даваў урокі фартэпіяннай ігры. Аўтар каля 100 музычных твораў, выдадзеных у Маскве, Вільні, Варшаве, Вене, Лейпцыгу. Памёр у 1844 годзе.

1895 год — нарадзіўся (вёска Погіры, цяпер у Дзятлаўскім раёне) Ігнат Сямёнавіч Дварчанін, беларускі літаратуразнаўца, паэт, публіцыст, грамадскі дзеяч. З 1919 года вёў культурна-асветніцкую работу. З 1926 года — у Вільні на выкладчыцкай рабоце. У 1928–1930 гадах быў адным з кіраўнікоў галоўнага ўпраўлення ТБШ. У 1928-м абраны паслом у Польскі сейм. За рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны польскімі ўладамі, у 1930 годзе асуджаны, вызвалены ў 1932-м у выніку абмену палітвязнямі. Працаваў у камісіі АН Беларусі па вывучэнні Заходняй Беларусі. Аўтар вершаў, публіцыстычных твораў. У 1927 годзе выдаў у Вільні «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 г.)» для сярэдніх школ, якая адыграла вялікую ролю ў навучанні і патрыятычным выхаванні. Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць». У 1933 годзе рэпрэсаваны, у 1937-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1956 годзе.

1920 год — нарадзіўся Іван Кажадуб, савецкі ваенны лётчык і ваенны дзеяч, Маршал авіяцыі, тройчы Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну ў знішчальнай авіяцыі, камандзір эскадрыллі, намеснік камандзіра палка. Удзельнічаў у 120 паветраных баях, збіў 62 самалёты праціўніка. Распрацаваў шэраг новых прыёмаў і спосабаў вядзення паветранага бою. Яго імем названы вуліцы ў Магілёве і Рагачове.

Было сказана

Янка КУПАЛА,
народны паэт Беларусі:
«К праўдзе ўвагі не знае, не чуе,
Як змяя, чалавечая злосць».

УСМІХНЕМСЯ

Тры дні не могуць спыніць дзяўчынку, якая скача на батуце ў пакоі з нацяжной столлю.

Муж вяртаецца ад урача і кажа жонцы:
— Мне доктар сказаў, што да раніцы не дажыву. Давай усю ноч будзем піць шампанскае і займацца сексам!
— Бач, які разумны! Табе ж раніцай не ўставаць...

Усё ж такі добра, калі ў сям'і ёсць агульныя інтарэсы. Ён любіць рыбалку, а яна — калі ён на рыбалцы.

Неяк вырашыў павесяліцца: у рэзюмэ, у графе «станоўчыя якасці», напісаў — адсутнасць сумлення. І тут жа сталі прапаноўваць та-а-акія пасады...

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н.КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 20.023. Індэкс 63850. Зак. № 2317.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 чэрвеня 2016 года.